16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 9 (5218) 3 сакавіка 2023 г. ISSN 0024-4686

Адрасы роднага слова стар. 4—5

Напоўніць прастору зместам стар. 12

Формула філасофскага каменя стар. 13

Культурны цэнтр краіны

Фота БелТА.

Помнік Анастасіі Слуцкай.

Слынная Анастасія Слуцкая, княгіня, якая ўзначаліла абарону горада ад татар і перамагла іх шматлікае войска; праведная Сафія Слуцкая, адна з нямногіх беларускіх святых; слуцкія паясы, што сталі выбітным айчынным брэндам — як шмат асацыяцый з невялікім цяпер горадам Мінскай вобласці, які, аднак, мае амаль тысячагадовую гісторыю!

Культурнай сталіцай Беларусі сёлета аб'яўлены Слуцк. І ў наданні гораду такога статусу — не толькі даніна павагі да слаўнай мінуўшчыны, але і выхаванне сучаснікаў: бо гэта выдатная нагода згадаць падзеі сівой даўніны, успомніць пра подзвігі нашых далёкіх продкаў-суайчыннікаў, задумацца аб тым, кім былі людзі, якія жылі на беларускіх землях: стваралі гісторыю, «вымошчвалі» дарогу ў вечнасць змаганнем за незалежнасць і справамі ўмацавання веры…

Нішто не знікае бясследна. Так і зямля нашага краю, кожны куточак якога мае даўнія слаўныя традыцыі і прасякнуты духам гераізму, і надалей будзе надзейным аплотам веры, дабра, справядлівасці…

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку РСФСР Ірыну Купчанку з днём нараджэння. «Выключны талент і бязмежная адданасць мастацтву далі магчымасць вам дасягнуць прафесійных вышынь, заслужыць любоў і прызнанне публікі і калег. Сыграныя вамі ў кіно і на тэатральнай сцэне ролі сталі класікай, пакарыўшы сэрцы шматлікіх паклоннікаў, — гаворыцца ў віншаванні. — Упэўнены, вашы яркія работы і ў далейшым будуць садзейнічаць развіццю культурнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй».

Пашана. На пасяджэнні калегіі Міністэрства інфармацыі Беларусі былі ўзнагароджаны прадстаўнікі галіны. За актыўны ўдзел у рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі нагрудным знакам «Выдатнік друку Беларусі» ўзнагароджана галоўны рэдактар газеты «Гродзенская праўда» Лілія Навіцкая. За добрасумленную і плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў, актыўны ўдзел у рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі Ганаровымі граматамі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны генеральны дырэктар БелТА Ірына Акуловіч, намеснік генеральнага дырэктара БелТА Таццяна Бірук, прафесар кафедры інфармацыйнага права факультэта крымінальнай міліцыі Акадэміі МУС Аляксандр Іваноўскі, загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай філалагічнага факультэта БДУ Сяргей Лебядзінскі, дырэктар Брэсцкага філіяла РУП «Белсаюздрук» Мікалай Марэйка, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Марына Навіцкая, спецыяльны карэспандэнт «Сталічнага тэлебачання» Аксана Сямашка, начальнік навуковага аддзела мовазнаўчых і эканамічных даследаванняў Навукова-практычнага цэнтра Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Таццяна Лапуціна.

Музей. Сёння ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбудзецца IV навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь, ты збудавана з беларускіх слоў!». Міністэрства культуры паведамляе: для ўдзелу ў канферэнцыі было пададзена амаль 140 заявак вучняў 8-9 класаў агульнаадукацыйных школ Мінска і Мінскай вобласці. Арганізацыйны камітэт і журы канферэнцыі адабралі 73 работы да ўдзелу ў канферэнцыі. Па выніках разгляду заявак самымі папулярнымі асобамі, да творчасці якіх звярнуліся ўдзельнікі, сталі пісьменнікі-юбіляры гэтага года — Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Яўгенія Янішчыц, Адам Міцкевіч, Ніна Мацяш, Янка Маўр. Вынікі канферэнцыі будуць падводзіцца экспертным саветам — прадстаўнікамі акадэмічнай супольнасці, літаратарамі, педагогамі, супрацоўнікамі музея.

Вернісаж. Выстаўка «Глебаўка збірае сяброў. Мінск» адкрылася ў галерэі «Акно» Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава, піша БелТА. Мэта праекта — паказаць гледачу ўсю разнастайнасць творчых работ аўтараў, якія дэманструюць, з аднаго боку, класічную «глебаўскую школу», з іншага боку, індывідуальна сфарміраваны почырк кожнага жывапісца, графіка, скульптара. «Выпускнікі ўстановы займаюць самыя розныя нішы беларускага і сусветнага мастацтва, — адзначаюць арганізатары. — Мастацкі каледж імкнецца да захавання самых цёплых адносін са сваімі выпускнікамі і заўсёды ганарыцца іх поспехамі». «Глебаўка збірае сяброў. Мінск» пачынае агульны цыкл выставачных праектаў.

Праект. Сёння ў Нацыянальным мастацкім музеі адбудзецца канцэрт у рамках выстаўкі скульптуры і графікі Аляксандра Фінскага. «Фармат жывога гучання абраны нездарма: вялікая колькасць работ майстра прысвечана музыцы. Спевы ў выставачнай зале створаць асаблівую атмасферу адзінства гармоніі гуку і формы, — тлумачаць арганізатары. — У канцэрце наведвальнікі праслухаюць вядомыя творы Баха, джазавае папуры на тэмы Моцарта, апрацоўкі народных песень, сучасную беларускую і замежную музыку ў выкананні Дзяржаўнага камернага хору пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі Наталлі Міхайлавай. У канцэрце прыме ўдзел лаўрэат міжнародных конкурсаў піяніст Іван Фінскі».

Рэгіён. У музеі гісторыі Брэста прадставілі скульптуру ваяводы Ціта, які абараніў жыхароў горада ад набегу ў Сярэднія вякі. Прэзентацыя адбылася падчас мерапрыемства «Подзвіг ваяводы». «Упершыню прадстаўлена скульптура "Берасцейскі ваявода Ціт. 1282 год", выкананая таленавітымі брэсцкімі скульптарамі Алесяй Гуршчанкавай і Паўлам Герасіменкам у 2022 годзе. Ваявода Ціт — сапраўдная гістарычная асоба, якая непасрэдна звязана з гісторыяй Брэсця XIII стагоддзя», — цытуе БелТА словы старшыні Брэсцкага гарвыканкама Аляксандра Рагачука.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Мацуючы патрыятызм

У гімназіі № 3 імя А. С. Пушкіна г. Віцебска адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў гарадскога літаратурнага конкурсу паэзіі сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі «Мой сябар, Айчыне прысвяцім душы цудоўныя парывы», прымеркаванага да дзён памяці А. С. Пушкіна і 85-годдзя з дня ўтварэння Віцебскай вобласці.

Дырэктар гімназіі Алена Матвеева адзначыла, што на працягу многіх гадоў установа з гонарам носіць імя вялікага рускага паэта.

У конкурсе бралі ўдзел юнакі і дзяўчаты з 27 віцебскіх школ і 4 гімназій. Навучэнцы прадстаўлялі творы ў 8 намінацыях. Назвай першай сталі знакамітыя пушкінскія радкі «Мой сябар, Айчыне прысвяцім душы цудоўныя парывы». Пераможцам у ёй стала вучаніца сярэдняй школы № 9 Кіра Анішчык. Дыпломам пераможцы ў намінацыі «85 гадоў з дня ўтварэння Віцебскай вобласці» стала вучаніца сярэдняй школы № 12 імя Л. М. Філіпенкі Вера Герашчанкава.

У намінацыі «Горад мой родны» першае месца падзялілі вучні сярэдняй школы № 33 імя І. Д. Чарняхоўскага Дар'я Каўтун і сярэдняй школы № 24 імя М. Ф. Маскаева Ганна Палякова. Раскрыць сваю любоў да вялікага паэта здолела найлепшая ў намінацыі «Пушкіну прысвячаецца…» Вераніка Бондарава з сярэдняй школы № 31 імя В. З. Харужай.

Свае першыя крокі ў напісанні вершаў юнакі і дзяўчаты паказалі ў намінацыі «Проба пяра». Членам журы складана было выбраць найлепшага пачаткоўца, таму перамогу падзялілі навучэнцы сярэдняй школы № 10 імя А. К. Гараўца Наталля Архіпенка і Назар Мякацін.

У намінацыі «Прырода і прыгажосць» перамога дасталася Кіры Лотыш з сярэдняй школы № 4. У намінацыі «Няхай будзе ўсім каханне» — навучэнцам сярэдняй школы № 44 Марыі і Алесі Давідоўскім.

«Знайсці сэнс быцця» (менавіта так называлася намінацыя) найлепш удалося вучаніцы сярэдняй школы № 24 імя М. Ф. Маскаева Паліне Персіянавай.

Пераможцаў конкурсу паэтычнай творчасці павіншаваў намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама В. В. Глушын. Старшыня віцебскага аддзялення СПБ Тамара Краснова-Гусачэнка ў сваім выступленні адзначыла, што пачуццё грамадзянскасці і патрыятызму нараджаецца разам з чалавекам, як і талент. Але мы ўсе павінны выхоўваць, умацоўваць гэтае пачуццё.

Прэс-цэнтр Віцебскага абласнога аддзялення СПБ

Натхняе Уздзеншчына

У апошні зімовы дзень ў цэнтральнай раённай бібліятэцы г. Узда адбылося святочнае мерапрыемства з нагоды 80-гадовага юбілею аднаго з найстарэйшых пісьменнікаў Міншчыны Дзмітрыя Вінаградава. Літаратурная творчасць празаіка, краязнаўцы, дзіцячага пісьменніка ўжо шмат гадоў знаходзіць водгукі не толькі сярод беларускіх кнігалюбаў, але і за мяжой.

На імпрэзе гучала шмат добрых слоў у адрас юбіляра ад кіраўніцтва раёна, абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, удзячных чытачоў. Шчыра і сардэчна павіншавалі Дзмітрыя Леанідавіча калегі па пяры, удзельнікі уздзенскага літаб'яднання «Нёманец» і народнага літаратурнага аб'яднання «Выток» з г. Дзяржынска.

У сваю чаргу Дзмітрый Вінаградаў адзначыў, што Уздзеншчына — гістарычна спрыяльнае асяроддзе для развіцця літаратурных традыцый. Малая радзіма, яе багатая гісторыя заўсёды натхняла і натхняе прыхільнікаў мастацкага слова.

Падчас імпрэзы.

Імпрэза скончылася музычным віншаваннем, у якім разам з прафесійнымі выканаўцамі ўдзел прынялі ўнучка і праўнучка пісьменніка.

Рагнед МАЛАХОЎСКІ
Фота аўтара

Магутнае слова

У Міжнародны дзень роднай мовы ў кнігарні «Іскра» Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі арганізавала творчую імпрэзу «Магутнае слова, ты, роднае слова!», у якой прынялі ўдзел студэнты, школьнікі і пісьменнікі.

Маладыя паэты, студэнткі філалагічнага факультэта БрДУ Ірына Макарчук і Кацярына Мізерыя натхнёна прачыталі свае вершы, расказалі, як адкрылі багацце беларускай мовы і паэтычны дар. Паэт, выдавец, кіраўнік літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Наталля Кандрашук праз вершы і лірычныя прызнанні распавяла, як беларуская мова паўплывала на яе творчасць, светапогляд. Празаік, аўтар гістарычных прыгодніцкіх твораў Анатоль Брытун у сваім аповедзе падкрэсліў важнасць ведання роднай мовы, а лаўрэат Нацыянальнай прэміі Беларусі, пісьменніца Зінаіда Дудзюк паглыбілася ў гісторыю беларускай мовы, захапляючы прысутных цікавымі фактамі і гіпотэзамі, зрабіла агляд сваіх раманаў «Слодыч і атрута», «Паляванне зграяй».

Асаблівую атмасферу свята стварылі юныя артысты аб'яднання па інтарэсах «Тэатральная творчасць» СШ № 9 г. Брэста, якім кіруе настаўніца Вольга Наўцэня. Дзеці падрыхтавалі спектакль па апавяданні Расціслава Бензерука «Чаму воўк не складае вершаў».

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

Самым удзячным чытачам

Міжнародны дзень роднай мовы стаў плённым для членаў Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, якія ўзялі ўдзел у шматлікіх мерапрыемствах, што праходзілі ў дзіцячых садках, школах, каледжах і вышэйных навучальных установах.

Цікавае мерапрыемства прайшло ў сярэдняй школе № 39 г. Гомеля: перад вучнямі выступіла пісьменніца Ганна Атрошчанка. Яна знаёміла дзяцей са сваімі творамі, распавядала пра значэнне роднага слова ў жыцці кожнага беларуса. А ў дзіцячым садку № 161 горада над Сожам Ганна Мікалаеўна сустрэлася з самымі ўдзячнымі і непасрэднымі чытачамі.

Насычаным Дзень роднай мовы быў і ў рагачоўскага літаратара Міхаіса Слівы: ён наведаў раённую бібліятэку, дзе сустрэўся з яе работнікамі і чытачамі. А яшчэ творца паўдзельнічаў у гульні «Родныя словы роднай мовы», арганізаванай супрацоўнікамі бібліятэчнай установы.

Мікалай ІГНАТОВІЧ

анонсы

Добрая традыцыя

9 сакавіка а 16-й гадзіне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё Дня праваслаўнай кнігі. Арганізатары — Беларуская праваслаўная царква, Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства адукацыі, Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр г. Мінска.

Святкаванне Дня праваслаўнай кнігі стала добрай традыцыяй. У гэтым выяўляецца велізарнае значэнне духоўнай літаратуры ў маральным выхаванні грамадства, у прыцягненні да тысячагадовай хрысціянскай гісторыі. У 2023 годзе ўрачыстасць прымеркавана да Году міру і стваральнай працы.

Мерапрыемствы, звязаныя з Днём праваслаўнай кнігі, пройдуць па ўсіх епархіях краіны. Трэба адзначыць, што многія літаратары з Саюза пісьменнікаў Беларусі правядуць імпрэзы, аўтограф-сесіі ў розных бібліятэках краіны. У прыватнасці, перад чытачамі выступяць празаікі, паэты, дзіцячыя пісьменнікі Таццяна Дземідовіч, Таццяна Канапацкая, Іна Фралова, Алена Стэльмах і іншыя.

Сяргей ШЫЧКО

не абмініце

Пад шоргат старонак сакавіка

Вясна дорыць новае. Сярод кніжных навінак, якія пабачаць свет у Выдавецкім доме «Звязда» ў сакавіку, прыярытэты аддадзены дзіцячай літаратуры.

Выйдзе зборнік «Творы для дадатковага чытання ў VI класе», дзе знойдзецца месца творам такіх вядомых літаратараў, як Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Генадзь Аўласенка. На рускай мове падрыхтаваны да сустрэчы з чытачом зборнік апавяданняў Валерыя Кастручына «Чудо-ягода». Аўтар шмат піша пра родную прыроду, пра насельнікаў лясоў і запаведнікаў, пра стасункі чалавека са звярамі і птушкамі. Творы двух аўтараў — Эдуарда Валасевіча і Пятра Сіняўскага — прадстаўлены ў кнізе «Дняпроўскі чарадзей. Зачараваная гаспадарка». Іх казкі напісаны даўно, але і зараз карыстаюцца ўвагай юнага чытача. Сапраўдныя ўрокі патрыятычнага выхавання — у зборніку нарысаў «Твары Вялікай Перамогі», які таксама выйдзе ў «Звяздзе» ў сакавіку.

Прыемным падарункам для чытачоў усіх узростаў, найперш тых, хто захоплены родным паэтычным словам, стане зборнік вершаў «Чыстая музыка неба», які ўклаў дасведчаны знаўца паэзіі, старшыня секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Віктар Шніп. Пад адной вокладкай сабраны творы Міколы Антаноўскага, які жыве ў Пружанах, Міколы Бусько з Баранавіч, а таксама Анатоля Шушко, які жыў і працаваў у Пінску і, на вялікі жаль, ужо пайшоў з жыцця. Такі вось «берасцейскі паэтычны сшытак» атрымаўся.

Раман СЭРВАЧ

імпрэзы

Месцы памяці і смутку

У літаратурным клубе «Шчырасць» пры публічнай бібліятэцы № 22 г. Мінска адбылася творчая сустрэча з пісьменнікам-публіцыстам і празаікам Міхаілам Нікіціным. Слухачамі былі пастаянныя ўдзельнікі клуба і вучні 8 «Б» класа сталічнай сярэдняй школы № 25.

Міхаіл Генадзевіч — публіцыст, празаік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядучы навуковы рэдактар Цэнтра энцыклапедычных выданняў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Аўтар кніг з серыі «Гісторыя для школьнікаў»: «Беларусь партызанская», «Шаги Великой победы. Освобождение Беларуси», «Дорогами Победы. К 70-летию операции "Багратион"», з'яўляецца адным са складальнікаў кніг серыі «Беларуская дзіцячая энцыклапедыя»: «Крепости Беларуси» і «Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы», рэдактар кніг серыі «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці»: «Масюкоўшчына. Трагедыя савецкіх ваеннапалонных», «Озаричи — дорога смерти» і інш.

Падчас творчай сустрэчы Міхаіл Генадзевіч расказаў пра апошнюю серыю навукова-папулярных кніг — «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці». Падрыхтаваная прафесійнымі беларускімі гісторыкамі, архівістамі, музейнымі работнікамі, яна прысвечана найбольш трагічным старонкам гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, месцам масавага знішчэння нацыстамі ваеннапалонных і мірных грамадзян, партызан і падпольшчыкаў на тэрыторыі Беларусі.

Сярод такіх мясцін — Хатынь, Масюкоўшчынскі лагер смерці, лагер смерці Трасцянец, Азарыцкі лагер смерці, Мінскае гета, Чырвоны Бераг і многія іншыя месцы смутку і памяці, якія ёсць у кожным раёне і ў кожнай вобласці краіны. Для падрастаючага пакалення гэтыя выданні з'яўляюцца неацэннай крыніцай ведаў, гісторыяй, якая не мае права быць забытай.

Аляксандра КАРЖАНЕЎСКАЯ

на развітанне

Скончылася зямное жыццё драматурга Аляксея Дударава

У фільме «Белыя росы», які зняты па сцэнарыі Аляксея Дударава, галоўны герой Фядос Ходас разумее, што прыйшоў яго вечар, просіць у сонца святла і цеплыні і кажа «дзякуй!» за жыццё. Гэтыя словы, што напісаў Аляксей Дударав, цяпер будуць гучаць і ад яго імя.

Ён мог дзякаваць жыццю за тое, як склаўся лёс — чалавечы і творчы. Шматгадовы старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў (з 1992 года, а ў 2022 годзе яго зноў пераабралі тэрмінам на 5 гадоў), паспяховы драматург, які быў запатрабаваны ў кіно: стужкі па яго сцэнарыях дагэтуль глядзяцца з цікавасцю. Здавалася, што чалавек аднойчы знайшоў сябе, і справа сама яго несла да поспеху. Але справа гэта творчая, агмень творчасці ўвесь час трэба сілкаваць.

І тут усё ішло ад жыцця, ад набліжанасці і ведання людзей — самых розных. Бо перш чым прыйсці ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, ён, народжаны ў сялянскай сям'і, паспрабаваў розныя рабочыя прафесіі. Але творчасць прынесла яму павагу калег па тэатры і ўсесаюзную славу. І гэтая творчасць была павязана са словам. У 1979 годзе выйшла кніга прозы «Святая птушка», прычым, выдадзеная на рускай мове ў Маскве, яна стала папулярнай далёка за межамі Беларусі. А распавядаў аўтар пра жыццё і людзей, якіх бачыў і ведаў. Камусьці яны маглі падавацца дзівакамі. Але, можа быць, лепшае слова тут «адметнасць» — Дударав пісаў, як адчуваў. Вось і яго першая п'еса «Выбар» трымалася на гэтым адчуванні. У ёй ужо паўстала тэма вайны, пра якую малады чалавек ведаў па расповедах бацькі-франтавіка. За першую кнігу і п'есу яго адзначылі прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі. А крыху пазней з поспехам па ўсім Саюзе прайшлі яго «Радавыя»: у п'есе тэма гераізму гучала з яркім гуманістычным пасылам. Аўтар быў адзначаны прэміяй Усесаюзнага Ленінскага камсамола, а ў 1985 годзе атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР.

Яго цікавілі людзі — ці то ў экстрэмальных, ці то ў звычайных жыццёвых абставінах. Звычайныя людзі прыцягвалі Дударава сваёй простай праўдай і мудрасцю. Нездарма п'еса «Вечар» стала пазачасавай, а спектакль паводле яе з поспехам перайшоў з XX стагоддзя ў XXI. Аматары тэатра ішлі «на Дударава» і калі ён звяртаўся — а тэатры ўвасаблялі — да гістарычных асоб Беларусі. Назвы гавораць самі за сябе: «Князь Вітаўт», «Чорная панна Нясвіжа», «Палачанка», «Усяслаў Чарадзей»… Справа ўдзячная, бо для Беларусі вельмі актуальная. І адзнака: у 2001 годзе Аляксею Дударава была прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусі. А ў 2002-м айчыннаму драматургу прысудзілі прэмію Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі ў галіне літаратуры і мастацтва — за вялікі творчы ўнёсак у справу тэатра і кіно.

Імя Аляксея Дударава значыцца ў ліку аўтараў сцэнарыя для 16 фільмаў, сярод якіх — «Дняпроўскі рубеж» і «Брэсцкая крэпасць». Але менавіта «Белыя росы» з'яўляюцца галоўным кінахітом не толькі ў асабістай біяграфіі Дударава як аўтара сцэнарыя, але і ў беларускім кіно наогул. Фільм выйшаў на экраны ў 1984 годзе і стаў камедыяй года па версіі часопіса «Савецкі экран». І дагэтуль ён у топе самых касавых фільмаў за ўсю гісторыю беларускага кіно. Нездарма ў 2014 годзе быў зняты фільм «Белыя росы. Вяртанне», дзе Аляксей Дударав паспрабаваў уявіць, як развівалася гісторыя ў найноўшыя часы. Але, падавалася, ён не падзяляў часы на добрыя і складаныя, а разглядаў іх як агульны жыццёвы лёс народа, да якога належаў. Бо нават атрымаўшы шырокую славу, маючы прэм'еры ў тэатрах за межамі Рэспублікі Беларусь, ён заставаўся беларускім аўтарам, драматургам, дзеячам тэатра. Імя Аляксея Дударава — ужо частка гісторыі беларускай культуры, і цяпер можна сказаць словамі яго героя: «дзякуй» за жыццё.

Ларыса ЦІМОШЫК

Віктар ШНІП

Балада Аляксея Дударава

(6.06.1950—27.02.2023)

Вецер за вокнамі. Вецер
Снег абтрасае з бяроз.
Лямпа ці зорачка свеціць
Па-над зямлёю. Мароз
Зноў заўладарыў і ўночы
З горада гоніць вясну.
Спаць, як і ўчора, не хочаш,
Думаеш думу адну.
Чорная дама Нясвіжа
Сёння прыходзіла зноў.
Шэптам спытала: «Што пішаш?..»
«Пра чалавека й любоў…» —
Ты адказаў і ўсміхнуўся
Чыстай паперы. І ўміг
Ты сярод тых апынуўся,
Хто жыве ў творах тваіх…
І дзень пачаўся, як трэба
Дню пачынацца заўжды.
Сонца запоўніла неба.
Сонца не ўбачыў больш ты.
Снегам надыхаўся вецер
І ў адзіноце заціх.
Лямпа ці зорачка свеціць
Там, на шляхах незямных…

«ЛіМ»-люстэрка

Вялікі тэатр Беларусі 5 красавіка прадставіць на міжнародным фестывалі оперы і балета «Ташкенцкая вясна» легендарны спектакль — балет Арама Хачатурана «Спартак» у пастаноўцы Валянціна Елізар'ева. Упершыню яго ўбачаць ва Узбекістане на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра імя Алішэра Наваі (Ташкент). «Спартак», — адна з самых масавых пастановак тэатра. У спектаклі прымаюць удзел каля 50 артыстаў, паведамляюць у тэатры. Галоўныя партыі 5 красавіка выканаюць вядучыя салісты Вялікага тэатра Беларусі: народныя артысты Ірына Яромкіна, Антон Краўчанка, заслужаныя артысты Канстанцін Геронік, Юрый Кавалёў, Людміла Хітрова, Марына Вежнавец, а таксама Таццяна Уласень, Вікторыя Трэнкіна, Уладзімір Руда, Аляксандр Місіюк, Дзяніс Шпак і іншыя.

Віцебская «Лялька» прадставіць свой спектакль на I Міжнародным фестывалі тэатраў лялек «Палярная сава» ў Мурманску, піша БелТА. Беларусы плануюць прывезці туды сабраны з эпізодаў розных народных казак спектакль у дзвюх дзеях «Казкі пра казку». Гэта шэраг неверагодных гісторый, па меркаванні стваральнікаў і гледачоў, займальных і відовішчных, з глыбокім сэнсам. Як адзначылі ў тэатры, у Мурманску трупа пабывае не ўпершыню. У пачатку 2000-х віцебскія лялечнікі ўжо прывозілі музычную казку пра дапытлівага слоніка. Нягледзячы на тое, што пастаноўку гралі на беларускай мове, публіцы ўсё было зразумела і без перакладу. Пазней калектывы тэатраў Беларусі і Расіі падтрымлівалі сувязь, сустракаліся ў тым ліку на «Славянскім базары». І Міжнародны фестываль тэатраў лялек «Палярная сава» пройдзе ў Мурманску з 19 да 24 красавіка. Беларусь на ім прадставіць яшчэ адзін заслужаны калектыў — Гродзенскі абласны тэатр лялек.

Экспазіцыя беларускіх мастакоў, прысвечаная 145-годдзю вызвалення Балгарыі, адкрылася ў Доме дружбы, перадае БелТА. Як адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Балгарыі ў Беларусі Георгі Васілеў, прадстаўленая выстаўка адлюстроўвае дружбу народаў дзвюх дзяржаў. Загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў прафесар Яўген Шунейка, творы якога прадстаўлены ў экспазіцыі, расказаў, што праект быў арганізаваны вельмі хутка. Ён змяшчае работы сталых і зусім маладых мастакоў. Аднак усе карціны адлюстроўваюць Балгарыю — яе гісторыю і сучаснасць. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Пасольства Балгарыі ў Беларусі, актывісты Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, творчая інтэлігенцыя.

Вынікі 73-га Берлінскага міжнароднага кінафестывалю падвялі ў сталіцы Германіі. Ганаровага «Залатога мядзведзя» за ўклад у кінематограф атрымаў Стывен Спілберг, а галоўная ўзнагарода прысуджана фільму «На Адаманце» Нікаля Філібера. Узнагароду «Сярэбраны мядзведзь» (прыз вялікага журы) атрымала стужка «Чырвонае неба» (рэж. Крысціян Петцольд). «Сярэбраны мядзведзь» (прыз журы) дастаўся «Дрэннаму жыццю» (Жуан Каніжу). Прыз за найлепшую рэжысуру ўзяў Філіп Гарэль («Вялікая калясніца»). Поўны спіс пераможцаў змешчаны на сайце Берлінале.

Цырымонія ўручэння ўзнагарод Гільдыі кінаакцёраў ЗША адбылася ў Каліфорніі. Больш за ўсё прэмій аказалася ў камедыі «Усё ўсюды і адразу», якая ўстанавіла рэкорд па колькасці статуэтак за ўсю гісторыю (4). Сярод пераможцаў аказаліся Мішэль Ео (найлепшая жаночая роля), Джэймі Лі Кёрціс і Ке Хюі Куан (абодва за ролі другога плана), а таксама ўвесь акцёрскі склад карціны. Тым часам у Лос-Анджэлесе прайшла цырымонія ўручэння прэмій Асацыяцыі кінакрытыкаў Галівуда. Стужка «Усё ўсюды і адразу» таксама атрымала больш за ўсё ўзнагарод (6), у тым ліку за найлепшы фільм года, паведамляецца на партале *film.ru*.

Яшчэ адну статую мааі знайшлі на востраве Пасхі ў Палінэзіі, піша РІА «Новости». Скульптура была на дне возера, што высахла. Усяго на востраве каля тысячы статуй мааі, якія зроблены з порыстай горнай пароды — вулканічнага туфу. Самая высокая дасягае 33 футаў (прыблізна 10 метраў). Сярэдняя вага скульптур — тры — пяць тон. Але ёсць экзэмпляры і да 80 тон. Нядаўна знойдзеная скульптура меншая. Але знаходка застаецца важным археалагічным адкрыццём, бо паказвае, што тут могуць быць і іншыя мааі, пра існаванне якіх навукоўцы не здагадваліся. Да таго ж гэта першы выпадак, калі каменная статуя на востраве была знойдзена на месцы возера.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Пераемнасць любові ў часе

Прызнанні ў самых цёплых пачуццях да роднай мовы, вершы аб яе мілагучнасці, пажаданні плённых набыткаў і любові да сваёй зямлі гучалі падчас цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу эсэ «Адрасы роднага слова». Геаграфія падзеі ахапіла ўсю Беларусь: работы былі дасланы з самых розных куткоў краіны: ад Піншчыны да Полаччыны.

Удзельнікамі выступілі вучні старшых класаў рэспубліканскіх устаноў адукацыі, а іх навукова-практычнымі кансультантамі — настаўнікі.

— Работы расказалі пра пісьменнікаў, якія былі гасцямі ў вашых паселішчах і навучальных установах альбо нарадзіліся на вашай малой радзіме. Талент іншых быў выхаваны ў вашых краях. Так, вы паказалі адрасы беларускага прыгожага пісьменіства, і вельмі радуе тое, што і вы прыехалі з самых аддаленых вёсак, — звярнуўся з прывітальным словам да юных даследчыкаў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч. Ён выказаў спадзяванне, што, незалежна ад таго, ці стане літаратуразнаўства справай жыцця кожнага, хто паспрабаваў сябе ў ролі гісторыка літаратуры, мастацкае слова ў паэзіі, прозе і публіцыстыцы стане іх верным спадарожнікам.

Жанр эсэ не вельмі традыцыйны для школьных прац, таму, як прызналіся сябры журы конкурсу, яны з хваляваннем чакалі, што некаторыя аўтары могуць абмінуць складанасці творчага жанру. Сярод намінацый была тэма, дзе школьнікі распавядалі пра ўражанні ад наведвання музейных і бібліятэчных выставак, дзяліліся эмоцыямі аб тэатральных пастаноўках…

Наталля Шапран, галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова», падзялілася настроем ад прачытання эсэ. Яна адзначыла, што і падзея конкурсу, і творчыя работы выклікалі яркія, насычаныя эмоцыі праз шчырасць, непасрэднасць, любоў, якімі яны былі напоўнены, замілаванасць родным краем і малой радзімай; а мясціны, пра якія распавядалася ў работах, сталі нашмат бліжэйшымі і больш зразумелымі. Рэдактар часопіса падкрэсліла і прафесійную працу настаўнікаў, якія спрычыніліся да падрыхтоўкі эсэ.

— Мы нават пазнаём часам школу, адкуль дасылаюцца работы, а бывае, што і аўтарытэт, які за імі стаіць, — заключыла яна. — Такі шчыры ўзаемаабмен любові з родным словам захапляе.

Рэдакцыяй часопіса былі адзначаны некалькі творчых работ, якія парадавалі найбольш — тым, што аўтары расказвалі пра значэнне выдання ў іх пошукавым жыцці і навуковай працы, дзяліліся ў эсэ ўражаннямі аб кнігах, да падрыхтоўкі якіх спрычыніўся рэдактарскі калектыў. За творчае ўвасабленне тэматыкі конкурсу спецыяльныя прызы былі ўручаны Дар'і Кісялёвай, вучаніцы СШ № 15 Магілёва, Максіму Аляксейчыку з Ляснянскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна, Марыі Новік з гімназіі № 1 Слоніма, Аляксею Кавальчуку з Мётчанскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна і Софіі Брышчэн з Павіцеўскай сярэдняй школы Кобрынскага раёна.

У намінацыі конкурсу гучала тэма водгуку на творчы лёс леташніх пісьменнікаў-юбіляраў. Так, найбольшая ўвага была прыцягнута да 140-годдзя народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Музеі класікаў адгукнуліся на прапанову журы конкурсу і вылучылі работы, якія найлепш асвятлялі тэматыку купала-коласаўскага года. Памятныя прызы — эксклюзіўнае падарункавае выданне «Казкі жыцця» Я. Коласа і сертыфікаты на наведванне музеяў атрымалі Марыя Бабіцкая з Забашавіцкай сярэдняй школы Барысаўскага раёна, Валерыя Вевель з 1-й гімназіі Барысава, Дар'я Гаўрыловіч з 31-й мінскай гімназіі і Мацвей Нарывончык з 2-й гімназіі Брэста.

Падчас уручэння ўзнагарод.

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна Галінская адзначыла пэўную пераемнасць любові да роднай мовы ў часе:

— Нядаўна мы адкрывалі выстаўку «Ураджай друкаванага слова», прысвечаную артыкулу Купалы пра тое, што 1922 год быў найбольш ураджайны ў выдавецкай справе Беларусі за ўвесь час. А праз стагоддзе — іншы ўраджай, ураджай творчых конкурсных работ... Жадаю ўдзельнікам і надалей працаваць на карысць культуры Айчыны, — павіншавала яна юных талентаў.

Змястоўным стала віншаванне Алеся Бадака, у якім літаратар падзяліўся досведам напісання ранніх вершаў і разважаннямі над складанасцямі жанру эсэ, распавядаў пра супрацоўніцтва з часопісамі «Бярозка» і «Маладосць» на самым пачатку свайго творчага шляху. Згадаў шлях да роднага слова і Віктар Шніп. Арганізатарамі конкурсу эсэ выступілі рэдакцыі часопіса «Роднае слова» і газеты «Літаратура і мастацтва» пры падтрымцы выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» і Саюза пісьменнікаў Беларусі.

* * *

Кожнае конкурснае эсэ вылучалася грунтоўнасцю і сур'ёзнасцю. Прапанаваныя да ўвагі чытача работы, на думку рэдакцыі, найбольш адпавядаюць лімаўскай тэматыцы.

Марыя ЯРАШЭВІЧ

Мая зямля пад белымі крыламі

«Бацькаўшчына», «бацькоўская зямля», «родная старонка» — такімі шчырымі словамі мы называем той адзіны і непаўторны куточак на зямлі, дзе нарадзіліся, выраслі і спазналі першыя радасці і няўдачы. Любоў да яе — пачуццё вечнае і нязменнае, без якога не можа існаваць сумленны чалавек.

Думаючы пра бацькоўскі дом, калыску маленства, мы думаем пра Беларусь — вялікую Радзіму.

Апошнім часам вельмі часта чую: малая радзіма. Што гэта такое? Адкуль і дакуль яе межы?

На мой погляд, малая радзіма — гэта наша дзяцінства, тое, што бачаць дзіцячыя вочы, месца, дзе на душы заўсёды лёгка, дзе б ты ні апынуўся. Для мяне самы родны куточак — маё Круглае, што раскінулася за пяцьдзясят кіламетраў ад абласнога цэнтра. Гарадок наш невялікі, налічвае крыху больш за сем тысяч жыхароў. Гэта блізкая і знаёмая з маленства мясціна і ёсць частка таго вялікага і святога, што мы называем дарагім словам «Бацькаўшчына».

Бацькаўшчына... Гучыць горда і ўзвышана.

Беларусь... Больш мякка і цёпла. Белая Русь… Спрадвеку белы колер увасабляў чысціню, бязгрэшнасць, гасціннасць, свабоду, таму сімвалічнай з'яўляецца назва нашай краіны — Белая Русь. Беларусь захавала сваю чысціню, бо ніколі не адбірала чужой зямлі, вольнасці ў другіх народаў, мела павагу да іх.

Практычна кожны куток Беларусі ўжо апеты пісьменнікамі, Родны кут — гэта не толькі матухна Зямля. Гэта, у першую чаргу, людзі. Нядаўна прачытала пра менталітэт беларусаў. Вельмі зацікавілася значэннем гэтага слова: «менталітэт» паходзіць з французскай мовы і азначае «склад розуму», «лад думак», «мысленне».

У нарысе «Зямля пад белымі крыламі» У. Караткевіч вызначае элементы менталітэту беларусаў: памяркоўнасць, шчырасць, гасціннасць, шчодрасць, мяккасць, працавітасць, паэтычнасць душы, цярплівасць, рашучасць. Людзі, якія штодзень знаходзяцца побач — родныя, суседзі, сябры, — валодаюць гэтымі якасцямі.

Увасабленнем чалавечай дабрыні, высакароднасці, працавітасці, эталонам усяго найлепшага з'яўляецца для мяне мая бабуля. Лёс не песціў яе, аднак бабуля захавала душэўную прыгажосць.

У маёй бабулі самыя ласкавыя і добрыя рукі, яны могуць усё. Гады пакінулі свой след на яе твары. На лбе — насечкі, «завіруха завеяла скроні», твар ужо не той, што раней, калі Марыя Іванаўна была маладой, але вочы захавалі той жа позірк. У іх — дабрыня і ласка, цеплыня і турбота. У бабулі самае добрае і чуйнае сэрца — у ім ніколі не гасне любоў да людзей, яно ні да чаго не застаецца абыякавым.

Самааддана працуюць у нашай школе настаўнікі, прысвячаючы сваё жыццё нам, вучням. З іх дапамогай мы не толькі набываем веды, але і вучымся жыццю, чалавечым узаемаадносінам і дабру.

У мяне спакойна на душы, бо побач чулыя, працавітыя людзі, якія заўсёды зразумеюць і падтрымаюць, я адчуваю сябе ўтульна побач з імі.

Можа, гэта ўсё і ёсць мая Радзіма?

Радзіма — тое месца, куды чалавек можа заўсёды прыйсці ў шчасці і ў горы, якое дапаможа яму перамагчы нягоды. Але часам людзі шукаюць лёгкага жыцця, лепшай і прыгажэйшай радзімы. Я лічу, што адсутнасць сувязі з родным краем — страшная з'ява.

На гэтую думку падштурхнуў мяне верш «Маналог вавёркі» Яўгеніі Янішчыц. Ён вельмі ўзрушыў:

Вось і мяне, як іншых, прыручылі...
А я ж сама ірвалася штосілы
З зялёнага свайго кутка ляснога,
Шукала іншы, болей прыгажэйшы,
Мяняючы пры гэтым процьму дрэў...
І вось знайшла... адно навекі кола,
Дзе ў ім кручуся звыкла і нястомна…
Калі кручу капронавае кола
І разам з ім сама ж у ім кручуся —
Я ўспамінаю па-над лесам зоры
І, нібы ў зорах, гнуткую ляшчыну,
З якой скаціўся спелы ўжо арэх...
Грэх на душы, калі ў імшастых травах
Апроч мяне не знойдуцца нікому
Крамяныя мае баравікі...

І я зразумела, што гэта самае страшнае — стаць «вавёркай у коле», для якой родны лес, крамяныя баравікі, імшастыя травы існуюць толькі ва ўспамінах.

Я ганаруся сваімі роднымі мясцінамі і тым, што мне выпала шчасце нарадзіцца і жыць на прыгожай і ветлівай Круглянскай зямлі.

Маё Круглае, родны куточак,
Даражэй няма нідзе краю.
Нават з дрэўца кожны лісточак
Я да сэрца свайго прытуляю.

Што для мяне Бацькаўшчына? Гэта мой невялікі горад Круглае і мая вуліца, якая носіць назву Савецкая. Гэта і мой прадзед, якога я ніколі не бачыла, але вельмі люблю і дзякуючы якому жыву сёння пад мірным небам. Гэта мае сябры, родныя, настаўнікі, суседзі. Гэта і ластаўкі, які прылятаюць да нас кожную вясну. Гэта ўсё — мая Радзіма, мая «Зямля пад белымі крыламі».

Алена АЎСІЕВІЧ, вучаніца X класа, выхаванка ДУА «Круглянскі раённы цэнт творчасці дзяцей і моладзі "Вясёлка"»

Дзе мой край

Нярэдка, ідучы па вуліцах, заснежаных узгорках ці квітнеючых палях сваёй вёскі, я згадваю радкі з розных вершаў беларускіх паэтаў, якія б маглі апісаць мае пачуцці. Кожны раз у думках усплывае пытанне, якое задае Уладзімір Караткевіч: «Дзе мой край?»

«Не тое, каб я свядома імкнулася знайсці на яго адказ... Але было б сапраўды цікава даведацца, дзе ж маё месца ў свеце?» — працягваю думаць я. Чым хутчэй я крочу і чым хутчэйшы становіцца рытм, які адбіваюць мае валёнкі па мерзлай зямлі, тым гучней голас пісьменніка гучыць у маёй душы. Я ж ліхаманкава спрабую знайсці адказ на пытанне, якое мне так знянацку паставілі. Гляджу вакол сябе: снег, што нядаўна выпаў і лёг на галінкі дрэў белай прасціной, бясконцыя пагоркі... У нейкі момант я раптам спыняюся: перада мной раскінулася паляна, што была акружана лесам, а ў цэнтры яе — будынак, дакладней, тое, што ад яго засталося. У думках праносіцца: «Павінна быць, тут». Яскрава-агністы колер развалін досыць моцна вылучаецца з астатняй беласнежнай карціны. Памятаю, што чытала пра гэты дом, калі цікавілася творчасцю Напалеона Орды, таленавітага беларускага мастака. Ён аднойчы гасцяваў у гаспадара сядзібы Адама Хмары, а ў адзін з сонечных дзён адлюстраваў пабудову з яе ваколіцамі на палатне, ні на мазок не шкадуючы яскравых фарбаў. Міжволі ўспамінаю крыху больш пра мастака: яго цяжкі лёс і незгасальнае полымя ў душы. Яны часта не даюць мне заснуць, прымушаюць разважаць пра ўсё тое, што Напалеон Орда зрабіў для Беларусі, а таксама што я магу зрабіць для Радзімы... Усё ж думкамі вяртаюся да палаца — настолькі ён натхняе захапляцца ім. Гэта неяк дзіўна, што дзвесце пяцьдзясят гадоў таму на гэтым самым месцы, дзе я стаю, такім адзінокім і занядбаным, віравала жыццё.

Я падыходжу бліжэй да сядзібы, мімаволі прыслухоўваючыся да аддаленых крыкаў варон, з-за якіх атмасфера вакол становіцца загадкавай, палохае і таму прыцягвае. Аглядаю сцены, відавочна кранутыя часам, і ў думках спрабую ўзнавіць фамільныя партрэты, што калісьці ўпрыгожвалі гэты дом, вялізную бібліятэку ў суседнім пакоі, багатае аздабленне інтэр'ера. Здаецца, час тут спыніўся, каб я змагла акунуцца ў таемную атмасферу васямнаццатага стагоддзя. Ніколі б раней не падумала, што буду з заміраннем сэрца дакранацца да рэшткаў цэглы, якія ўжо, здавалася б, не маюць ніякага сэнсу для людзей, але ўсё ж захоўваюць у сабе доўгую гісторыю.

Разумею, што іду літаральна па той жа сцежцы, што і Якуб Колас акурат сто гадоў таму. Падыходжу да валуна, на якім ён сядзеў на фотаздымку, што я нядаўна бачыла ў адной з кніг па біяграфіі Канстанціна Міхайлавіча. Ці разважаў ён тады пра тое ж, што і я? Згадваю радкі з верша паэта «Ноч», які быў створаны на беразе ракі Чарняўкі, што і дагэтуль цячэ побач з маёй вёскай:

Знік у рунях і ў шаўкох
Хмарачак маўклівых,
І гусцей на землю злёг
Гэты змрок імглівы.

Мяне не пакідае адчуванне, быццам пад «змрокам», які ахутаў паселішча, ён меў на ўвазе загадкавы дух, што сыходзіць з гэтай сядзібы.

Даследуючы кожны куточак калісьці знакамітай сядзібы Хмараў, імкнуся злавіць і запомніць кожную сваю эмоцыю, каб нават на вялікай адлегласці ад гэтага месца быць здольнай адчуваць духоўную сувязь з ім. Цяпер у маім сэрцы ўсталяваўся спакой, бо, здаецца, я, у рэшце рэшт, знайшла адказ на пытанне, што такі працяглы час непакоіла мяне. Набліжаючыся да брамы, я паварочваюся тварам да сядзібы, каб апошні раз кінуць на яе позірк. У думках ізноў праносіцца: «Дакладна тут».

Пасля таго, як я даведалася, як выглядае мой край, не перастае хваляваць мяне жаданне розумам і нагамі спасцігнуць як мага больш прасторы, дзе мне наканавана жыць. Я іду па добра вытаптанай і таму слізкай сцежцы, уважліва пазіраючы навокал. Набліжаюся да чатырох велічэзных дубоў, — такіх тоўстых, што я, пэўна, ніколі не змагу абхапіць іх ствалы рукамі; яны стаялі ў калону, адзін за адным. «Такі ж стары і мой край. Як і велічны дух яго», — думаецца мне. Не сцішваючы крокі, а нават паскараючы, абыходжу з аднаго боку адно дрэва, потым — другое ўжо з другога боку — «змейкай», як бы азвалася з дзяцінства. Вяртаюся на сцежку і ажно ўскокваю ад нечаканасці сутыкнення з нечым: ледзьледзь не збіла чалавека з ног! І адкуль ён толькі ўзяўся тут?! Радуючыся, што мяне не напаткала шчасце ўпасці долу, гляджу на чалавека і нервова пасміхаюся. Ён жа, бы ні на кроплю не разгубіўшыся, толькі ўсміхнуўся і прамовіў: «Усё добра. Са святам!»

Пакуль я ўспамінала, што сёння за свята, нібы марудна гартаючы ў думках старонкі календара, мужчына рушыў наперад. Зрабіўшы колькі крокаў па яго слядах, я ўбачыла групу людзей у дзіўных касцюмах і доўгае жазло ў руках чалавека, з якім я хвіліну таму сутыкнулася; зверху, на канцы жазла, красаваўся вялізны сонечны блін. «Каляды — дакладна! А гэта калядоўшчыкі», — знайшла я адказ. Да вушэй данёсся спеў — сапраўды, калядны матыў, яшчэ і на беларускай мове. Усмешка сама папаўзла па твары — каго ж не прываблівяюць народныя песні на роднай мове? Я падыходжу крыху бліжэй да калядоўшчыкаў, спадзеючыся, што мне дадуць хоць на нейкі час магчымасць атрымліваць асалоду ад музыкі. Адарваўшы позірк ад усмешлівых людзей, я паглядзела за іх спіны: тут стаяла пабудова накшталт сядзібы, а над ёй, у блакітнай высі, клубіўся дым. Я з сумам зразумела, што калядоўшчыкі могуць з хвіліны на хвіліну сысці ўнутр. Калі перавяла позірк на іх, ужо крыху знаёмы мне мужчына паглядзеў на мяне і махнуў рукой, нібы запрашаючы да сваіх сяброў. Я ўсміхнулася і няпэўна кіўнула — дзякуй, не хочацца перашкаджаць. На маё здзіўленне, праз момант група рушыла да брамы і выйшла на дарогу, працягваючы — хтосьці спяваць, а хтосьці — танчыць ды іграць на скрыпцы. Я паспяшалася за імі.

Так мы некаторы час ішлі, пакуль адзін з калядоўшчыкаў — з вялікім мехам на спіне — не збочыў і не пайшоў да дзвярэй нейкай хаты. Хутка адтуль выйшла немаладая жанчына, а астатнія музыкі накіраваліся да яе. Так я назірала за калядаваннем, а часам нават удзельнічала ў гэтым таемстве, пляскаючы ў далоні, падпяваючы, калі ведала тую ці іншую песню. Са шчырай радасцю ў сэрцы я шукала і знаходзіла на тварах людзей, якія ніяк не чакалі «натоўп звяроў» да сябе ў госці, адлюстраванне гэткага ж шчасця. Здаецца, ніколі дагэтуль я так моцна не адчувала наш народны дух і ніколі мне не было настолькі прыемна быць часткай такога важнага абраду. Я нібыта зазірнула ў шчыліну, з якой прабівалася асляпляльнае святло душы беларускага народа.

Дзве гэтыя падзеі: сустрэчы з загадкавым палацам Хмараў і з калядоўшчыкамі — надта добра далі мне спазнаць свой край, каб яшчэ калі-небудзь задавацца пытаннем пра яго месцазнаходжанне. Гэта не столькі мая вёска, колькі ўся Беларусь — старажытная і з багатай гісторыяй, як палац, і жывая, поўная сіл, як народ і яго мова. Ідучы ўжо ў цемры — так доўга мяне не магла адпусціць цудатворная сіла калядавання — у напрамку да сваёй хаты, я ўсміхалася снегу, які падаў на вейкі, і думала аб тым, што жыццё — цудоўная штука.

Святлана ТАРАСЕВІЧ, вучаніца Х класа ДУА «Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта»

Раён, дзе жывуць пісьменнікі

Я жыву ў Лошыцы, і, здаецца, мне вельмі пашанцавала з месцам пражывання, бо мой раён можа расказаць безліч цікавых гісторый — варта толькі прыслухацца да яго. Здавалася б, звычайны сучасны «спальны раён» — адкуль у яго цікавыя гісторыі? Але менавіта тут самая высокая ў Мінску канцэнтрацыя вуліц, названых імёнамі беларускіх пісьменнікаў. Дзе, як ні тут, жыць гісторыям? Таму сёння я стану пасрэднікам паміж вамі і маімі вуліцамі.

Пачаць хацелася б непасрэдна з той, на якой жыву, — вуліцы Уладзіслава Сыракомлі. Сыракомля — псеўданім, і ўзяты ён пісьменнікам невыпадкова. Менавіта так называўся родавы герб сям'і, з якой паходзіў мой герой. Яго сапраўднае імя — Людвік Уладзіслаў Францішак Кандратовіч. Нясвіж, Навагрудак, Вільня, Стаўбцоўшчына — менавіта гэтыя беларускія мясціны былі для Сыракомлі роднымі, але і Мінск адзначыўся ў яго жыцці: з мінскім колам літаратараў Сыракомля падтрымліваў моцныя сувязі, у мінскім гарадскім тэатры з вялікім поспехам ішлі яго п'есы, Мінску ён прысвяціў грунтоўны нарыс «Мінск: агляд сучаснага стану». Значэнне Сыракомлі для нашай і польскай культуры сапраўды вялікае: ён з'яўляецца беларускім і польскім паэтам, драматургам, перакладчыкам, літаратурным крытыкам і краязнаўцам. Яго творчасць моцна паўплывала на фарміраванне беларускай літаратуры новага часу. Быў добрым знаўцам фальклору, вывучэнню Беларусі прысвяціў шмат гісторыка-краязнаўчых прац. Яго імя носіць не толькі вуліца ў маёй Лошыцы, але і ў Пінску, Гродне, Навагрудку, Стоўбцах і Нясвіжы. У Варшаве яго імем называюцца адразу дзве вуліцы: вуліца Людвіка Кандратовіча і вуліца Уладзіслава Сыракомлі.

Побач з Сыракомлем у Лошыцы па-суседску размясціўся Казімір-Рафал Каралевіч Кастравіцкі. У яго было шмат псеўданімаў і крыптанімаў: Будзімір, К. Шашаль, К. Качанец, К. К., але ведаем мы яго як Каруся Каганца. Ён быў не толькі паэтам, але яшчэ і драматургам, мовазнаўцам, мастаком, скульптарам і грамадскім дзеячам. У яго вельмі шмат прац і дасягненняў, нават цяжка ацаніць яго ўклад у культуру, але, на мой погляд, самай цікавай з'яўляецца распрацоўка праекта адмысловага беларускага алфавіта. Каганец вывучаў кірыліцу, лацініцу, арабіцу і іншыя азбукі, намагаючыся вылучыць найбольш прыдатныя для перадачы беларускіх гукаў знакі. Таксама ён спрабаваў скласці ўласнабеларускі алфавіт. Чарнавік гэтага праекта захаваўся да нашых дзён.

Вуліца, на якой знаходзіцца мая школа, — Янкі Лучыны. Сапраўднае імя паэта — Іван Люцыянавіч Неслухоўскі. Янка Лучына — адзін з псеўданімаў, найбольш часта ім ужываны. Так паэт падпісваў толькі творы на беларускай мове. «Узяты ад страчанай часткі прозвішча продкаў, прыдомка Лучыўка, псеўданім сімвалізаваў духоўную лучнасць творчасці паэта з беларускім народам і яе асветніцкую ролю, прыпадобненую лучыне, сціплай крыніцы святла ў сялянскай хаце», — пішуць аб гэтым даследчыкі. На жаль, да нас дайшло няшмат яго вершаў, усяго толькі 14. Безумоўна, іх было больш, але адсутнасць беларускага друку і, адпаведна, магчымасць захоўваць вершы ў прыватных бібліятэках загубіла безліч скарбаў нашай літаратуры. У вершах Лучыны раскрывалася тэма беларускай вёскі, яе няпростага жыцця. Носьбітам беларускай ментальнасці Лучына бачыў найперш селяніна і ў гэтым працягваў традыцыі Сыракомлі. Сёння школьнікам такі пункт гледжання нават крыўдны: чаму з кола носьбітаў беларушчыны былі выключаны гараджане, заможная шляхта? Але Сыракомлю і Лучыну я магу зразумець: па-першае, яны былі спадчыннікамі рамантычнай традыцыі ў літаратуры, а рамантыкі лічылі просты народ ідэальным, а па-другое, навідавоку ў абодвух была шляхта, якая сапраўды цуралася беларускага.

Самая новая з «пісьменніцкіх» вуліц — вуліца Алеся Дудара. Для мяне гэтая гісторыя самая блізкая і цікавая. Назву вуліца атрымала толькі ў 2018 годзе, таму, гледзячы на жыхароў нашага раёна, разумею, што нямногія ведаюць, хто гэта наогул такі. Нават націск у яго прозвішчы няправільна ставяць, а я хаджу і выпраўляю, бо гэта важна для мяне. Аляксандр Аляксандравіч Дайлідовіч быў вельмі таленавіты: і паэт, і крытык, і перакладчык. Насуперак усім стэрэатыпам, якіх прытрымліваліся яго сучаснікі — падлеткі, Алесь ніколі не пісаў пра вёску, ён заўсёды жыў у горадзе і пісаў толькі пра горад. Малады і энергічны хлопец быў адным з заснавальнікаў літаратурнага аб'яднання «Маладняк», удзельнікам аб'яднання «Полымя» і вельмі моцным крытыкам. Перакладаў з рускай, нямецкай, французскай моў. Першым у беларускай літаратуры пераклаў раман «Яўгеній Анегін» і яшчэ шмат твораў. Але, на жаль, яго зорка згасла ў самы яркі момант. Трапіўшы пад рэпрэсіі ў 1937 годзе, Алесь, як і больш за 100 прадстаўнікоў беларускай інтэлектуальнай эліты, быў забіты 29 кастрычніка 1937 года.

І гэта ж толькі пачатак знаёмства! Цяпер я ведаю, хто тыя людзі, якія далі імёны вуліцам майго раёна. Але колькі таямніц захоўвае гісторыя кожнага з іх! Назва вуліцы — толькі пачатак шляху да знаёмства з імі. І як кожная вуліца памятае безліч гісторый яе жыхароў — так і імя чалавека, што даў назву вуліцы, раскрывае перад намі безліч магчымасцей для вандроўкі ў гісторыю сваёй краіны. Усё ж гэта вельмі добрая і карысная традыцыя — даваць вуліцам імёны сваіх творцаў. І я веру, што мая гісторыя з імі толькі пачынаецца.

Юлія ГАНЧАРЫК, вучаніца XI класа ДУА «Сярэдняя школа № 130 г. Мінска імя Рут Уолер»

Слова мае Ганна Галінская.

Фота Кастуся ДРОБАВА

Святы абавязак

Напрыканцы мінулага года ў гродзенскім выдавецтве «ЮрСаПрынт», якое пераважна арыентавана на выпуск літаратуры па гісторыі і культуры Гродна, свет пабачыў зборнік лірыкі пад назвай «Памяць — бяссмерце народа». Выданне ў цвёрдай вокладцы ўяўляе своеасаблівае паэтычнае развітанне з Годам гістарычнай памяці і складаецца з вершаваных рэфлексій членаў Саюза пісьменнікаў з нагоды тых ці іншых гістарычных падзей. Укладальнікамі зборніка выступілі старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Міхась Пазнякоў і член Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара Кавальчук.

Паводле меркавання Міхася Пазнякова, святы абавязак паэтаў і пісьменнікаў — надаць належную ўвагу «нашай гісторыі, як далёкай, так і нядаўняй — дзеля знітавання грамадства, міру і далейшага роскві́ту». Зрэшты, акцэнт у кнізе робіцца менавіта на падзеях, якія мелі месца не так даўно. Не абмінулі аўтары і тэму Вялікай Айчыннай вайны, укладу беларусаў у Вялікую Перамогу. На вызначальнай ролі гераічнага подзвігу народа Беларусі настойвае і аўтар прадмовы Міхась Пазнякоў: «І нават пасля развалу былой вялікай савецкай краіны Днём незалежнасці, Днём Рэспублікі Беларусь у нас мудра абвешчана велічная дата — 3 ліпеня. Менавіта ў гэты дзень у 1944 годзе наша слаўная сталіца была вызвалена савецкімі войскамі ад фашысцкіх захопнікаў».

У зборнік увайшлі творы трыццаці шасці паэтаў, напісаныя на рускай і беларускай мовах у розныя гады. Вершам кожнага з аўтараў папярэднічае кароткая біяграфічная даведка. Адкрывае кнігу Алег Ананьеў з сюррэалістычнай элегіяй «Общаясь с памятью, как с Богом…». Творца пераказвае кашмар, атрыманы ім у спадчыну ад продкаў: лірычны герой бачыць страшны сон пра вайну, якой сам не зазнаў, але якую перажыла яго маці. Выснова напрошваецца сама сабой: «А сон этот вовсе не странный: // Пусть не был я в адском огне, // Но память в крови моей мамы, // А значит — она и во мне…» Звяртаюць на сябе ўвагу некаторыя недасканаласці. Так, першы ў кнізе верш заканчваецца, як ні дзіўна, працяжнікам, а са слоў «Общаясь с памятью, как с Богом…» пачынаецца другі твор (хоць назвы не мае і аддзяляецца ад папярэдняга знакам ***).

Пераважна ў зборнік трапілі творы класічных форм і жанраў. Адысці ад канонаў адважыліся нямногія. Прыкметна на агульным фоне вылучаецца, напрыклад, Таццяна Жылінская. Верш «Сон» аўтарства пісьменніцы выяўляе дзіўныя перакліканні са згаданым вышэй творам Алега Ананьева. «Что-то часто мне женщина эта снится. // Страшный год сорок первый // И крепость Брест», — завяршае споведзь паэтэса. Без блытаніны не абышлося і тут: памылковая вёрстка сказіла сэнс твора. Разнастайнасцю парадавалі вершы Віктара Шніпа, чыя падборка «невымоўных» прысвячэнняў («Сонца Франціша Скарыны», «Невымоўнае Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча», «Зямля Фердынанда Рушчыца») бяссрашна абвяргае прымат рыфмы.

У новым зборніку таксама можна знайсці вершы Лёлі Багдановіч, Дар'і Дарошкі, Зінаіды Дудзюк, Андрэя Душачкіна,

Тамары Кавальчук, Людмілы Кебіч, Міхаіла Кулеша, Міхася Пазнякова, Лізаветы Палеес, Валянціны Паліканінай, Надзеі Парчук, Генрыха Тарасевіча і многіх іншых.

Каміла НАВІНКІНА

Ажываюць мінулага дні

Следам за зборнікам паэзіі «Памяць — бяссмерце народа» ў выдавецтве «ЮрСаПрынт» выйшаў тэматычна блізкі зборнік прозы — «Подых часу». За ўкладанне кнігі, прысвечанай Году гістарычнай памяці, адказвалі тыя ж Міхась Пазнякоў і Тамара Кавальчук. Выданне працягвае і развівае ідэі папярэдняга: пад цвёрдай вокладкай на трохстах старонках змешчаны апавяданні, навелы і біяграфічныя нарысы, у якіх літаратары аддаюць належнае героям гістарычных падзей альбо дзеляцца асабістымі ўспамінамі, увекавечваючы памяць сяброў, продкаў, настаўнікаў… Мастацкае слова тут суседнічае з публіцыстычным.

Асновай зборніка стала проза малых форм на рускай і беларускай мовах за аўтарствам літаратараў — членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кніга мае два раздзелы: мастацкіх твораў «Ажываюць у словах мінулага дні» і публіцыстыкі «У кожным радочку — гісторыі голас». На думку аўтара прадмовы Наталлі Саветнай, «сёння, у складаны гістарычны час, як ніколі актуальна пытанне захавання ў імя будучыні памяці аб мінулым народа і краіны, а беражлівыя адносіны да гісторыі ўжо сталі часткай нацыянальнай ідэі». Зрэшты, як і ў выданні «Памяць — бяссмерце народа», у кнізе «Подых часу» з усяго масіву звестак аб «мінулым народа і краіны» акцэнт робіцца менавіта на падзеях папярэдняга стагоддзя і ў першую чаргу — на Вялікай Айчыннай вайне.

Аўтар прадмовы звяртае ўвагу чытачоў на праблему захавання памяці аб страшэнных падзеях 1940-х гадоў: «Пасля Вялікай Айчыннай вайны вырасла ўжо некалькі пакаленняў, якія ведаюць пра яе, у лепшым выпадку, па падручніках». (Гэта не так і дрэнна, бо, пагадзіцеся, лепш ведаць пра вайну па падручніках, чым зрабіцца яе ахвярамі.) Імкнучыся выправіць азначаны стан рэчаў, аўтары калектыўнага зборніка

звярнуліся да тэмы вайны. Яна спаўна раскрываецца ў такіх творах, як «Бабуля Агата» Тамары Кавальчук, «Макотра Кашы» Ніны Рыбік, «Подкоп» Наталлі Саветнай, «Перад расправай» Уладзіміра Гаўрыловіча, «Хлеб для партызанаў» Міхася Пазнякова, літаратуразнаўчым артыкуле «Ваенная тэма ў беларускай літаратуры» Уладзіміра Навумовіча, які па невядомай прычыне трапіў у раздзел мастацкай прозы, ды многіх іншых.

Зрэшты, не засталіся па-за ўвагай пісьменнікаў і іншыя старонкі ў слаўным тысячагадовым летапісе беларусаў. Так, аб чым ідзе гаворка ў гісторыка-публіцыстычных работах «Как Радзивиллы Речь Посполитую делили» (Якаў Аляксейчык), «Эволюция белорусской государственности» (Віктар Ермаловіч) альбо ў «Баладзе аб ліцвінцы Барбары і каралю Жыгімонту» на мяжы паэзіі і прозы (Зоя Капуста), няцяжка здагадацца па назвах. Асабістымі гісторыямі падзяліліся Наталля Касцючэнка (змешчаны ў кнізе ўрывак з рамана «Суровые уроки» прысвечаны маці пісьменніцы), Лідзія Возісава (у нарысе «Пад крылом Лебедзева» апавядаецца пра школьнага настаўніка словатворцы), Маргарыта Латышкевіч (пісьменніца прысвяціла цэлы цыкл сваім продкам) ды іншыя.

Каміла НАВІНКІНА

Мілагучнасць мовы

Нататка другая паводле часопіса «Узвышша»

Сёння спынімся на артыкуле Уладзіміра Дубоўкі «Некаторыя прыватныя выпадкі мілагучнасці нашае мовы» (1927, № 4), карысным майстрам прыгожага пісьменства, бо сярод функцый мастацкага стылю — эстэтычная.

Найперш аўтар засяроджваецца на выпадках, калі ў паэтычным творы парушаюцца нормы правапісу *ў*/*у*, што не спрыяе стварэнню менавіта эстэтычнага эфекту.

Мінула амаль сто гадоў, а пра гэта даводзіцца нагадваць паэтам: што дазвалялася на пачатку функцыянавання новай беларускай мовы, у XXI стагодзі выглядае як анахранізм. Варта працаваць над вершаваным радком і рабіць так, каб не адыходзіць ад усталяваных «Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008) нормаў, дзе, дарэчы, адсутнічаюць выключэнні ў фармулёўцы вышэйзгаданага правіла для паэзіі. Напрыклад, у радках *На узлеску чарніцы, суніцы // Баравік пад ялінай кашлатай…* рэдактар мог бы прапанаваць змены, дадаўшы злучнік *і*: *І на ўзлеску…* Калі ж *Ў* стаіць на пачатку радка, то яго ўжыванне можна пры жаданні абгрунтаваць толькі працягам сказа: *Як шмат такіх хат гаруе // **Ў** квітнеючай Беларусі!* Заўважым, аднак, што пачатак новага радка — гэта заўсёды паўза (ці міні-паўза), і вымаўленне *ў* патрабуе пэўных, нехарактэрных для нашага моўнага апарату высілкаў. Пачатковае *Ў* пасля апошняй зычнай у папярэднім радку або без працягу сказа — заўсёды падстава вярнуць верш на дапрацоўку: *…праляцеўшы над мостам // **ў** петраградскім дымку*.

Механічная замена рэдактарам (карэктарам) *у*/*ў* паводле правілаў выклікае парушэнне рытму, разбурае вершаваны памер: *Ды студзілі скразнякі. // Падманвалі людзі. // Запаўзаў у маю душу // Тумановы будзень*. Спрактыкаваны паэт, а магчыма, і чытач здагадаецца, што трэці радок меў наступны выгляд: *Запаўзаў ў маю душу*; выснова: радок трэба перарабляць, і гэта не становіцца непераадольнай перашкодай, бо ён нерыфмаваны: *У душу мне запаўзаў*. Падкрэслім: такія аперацыі над вершам мусіць рабіць перш за ўсё сам аўтар, магчыма, пры падказцы рэдактара.

Далей У. Дубоўка акцэнтуе ўвагу на сцягнутых (усечаных) формах кшталту *калісьці* і *калісь*, *трэба* і *трэ*, *нават* і *нат*. У гэтых выпадках пажадана кіравацца мілагучнасцю фразы: *калісь**ці ці**ха падышоў — калісь ціха падышоў*; *трэ**ба бы**ло зрабіць — трэ было зрабіць*; *мо**жа, жа**данне пераможа — мо жаданне пераможа*. Прывядзем прыклады з твораў: ***Трэ** будзе без крыўды падзяліць гаспадарку, а я застануся жыць у старшага — у Янука* (Змітрок Бядуля); ***Трэ** было спяшацца, і мы прыбавілі кроку* (Віктар Карамазаў); *Вось адзін палец вызваліўся, нібы паказвае **кудысь**, астатнія прагладжваюць горла* (Уладзімір Караткевіч).

Варта дадаць да гэтых усячэнняў і *мо* (*можа*), якое, разам з *нат*, карыстаецца асаблівай прыхільнасцю і ў паэтаў дзеля захавання абранай рытмікі радка: *Чаго мы, людзі, **мо** ніколі // І не дазнаемся, як трэба* (Якуб Колас), *Ты скажаш мне: «Даўно забытая…» // І **нат** падумаеш: «Чужая»* (Мікола Шабовіч); і ў празаікаў ды драматургаў дзеля мілагучнасці фразы, захавання яе гутарковасці: *А **мо** і не канец? **Мо** гэта пачатак слаўны?* (Міхась Лынькоў); *А **мо** смерць ужо прыглядаецца, з якога боку за мяне ўчапіцца?* (Аляксей Дударай).

Варта, аднак, разумець, што такія словы — адметнасць, на якой спыняецца вока чытача. І калі яны мільгаюць, напрыклад, у зборніку вершаў некалькі разоў, то ўзнікае адчуванне стылістычнай празмернасці і непераадольнае жаданне пазбавіцца ад іх, на чым, у прыватнасці, акцэнтаваў увагу Алесь Пісьмянкоў у сваіх занатоўках.

Мілагучнасцю маўлення пажадана кіравацца і пры карыстанні паралельнымі формамі кшталту *зноў*/*ізноў*, *стужка*/*істужка*, *груша*/*ігруша* і пад., ужыванне якіх нідзе не прапісана. Значыць, трэба абапірацца на правіла правапісу прыстаўных галосных перад спалучэннямі зычных, першым з якіх з'яўляецца *л* і *р*: *яны зноў прыйшлі — ён ізноў прыйшоў*; *прыгожая стужка — прыгожых істужак*, напрыклад: *Тут ён **і**зноў так кажа…* (Янка Купала); *З неба ліўся аго**нь і**стужкамі з вузламі* (Кузьма Чорны); ***І**грушамі трава зацярушана* (Рыгор Барадулін).

Развагі У. Дубоўкі па мілагучнасці, яго парады аўтарам і рэдактарам вартыя вывучэння і практычнага прымянення дзеля паляпшэння якасці друкаванага інфармацыйна-духоўнага прадукту і павышэння прэстыжу беларускай мовы.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

Альма — апавядальніца

Многія хлопчыкі і дзяўчынкі знаёмы з гераіняй твораў Алеся Марціновіча сабачкай Альмай. Палюбілі і яе сяброўку котку Лізу. А даведаліся дзеткі пра іх нямала цікавага і незвычайнага з кніжак «Альма. Прыгоды на зямлі і ў космасе» і «Ліза — пераможца тыгра». Сабачка Альма аўтару «дапамагала» пісаць кнігу «Оленёнок Саша и другие сказки», падказваючы, пра што яшчэ можна расказаць. І раптам адбылося нечаканае: Альме самой захацелася пісаць казкі. Гэтым жаданнем яна і падзялілася з Алесем Андрэевічам. Як быццам зрабіць гэта не так і цяжка.

Жаданне жаданнем, толькі ці атрымаецца што з гэтага? Можна, канечне, прыдумаць цікавыя эпізоды, але не кожны падасць іх па-свойму. Тым больш калі гэта сабачка. Доўга пісьменнік думаў, пакуль знайшоў выйсце. Яно ж аказалася не такім і складаным. Альма будзе што-небудзь пісаць, а тое, што атрымаецца, паказваць яму — каб мог нешта паправіць, падказаць. Некалькі месяцаў яна бавіла час за камп'ютарам, а Алесь Марціновіч праглядаў напісанае. У рэшце рэшт рукапіс быў гатовы. Узрадаваўся не толькі ён, але і Ліза: «Атрымалася!»

Задумаліся, як кніжку назваць. Альма прапанавала так: «Казкі, расказаныя Сабачкай Альмай». А чаму і не? Асноўную ж працу рабіла яна. Але Ліза прапанавала свой варыянт — «Казкі сабачкі Альмы» — і патлумачыла, чаму ён лепшы: «Адразу відаць, што ты і аўтар, і апавядальнік». На гэтым і пагадзіліся. Як усё адбывалася, Алесь Марціновіч расказаў у прадмове «Казку напісала… сабачка».

Кніга невялікая аб'ёмам, усяго сем твораў. Акурат такая, што юным чытачам і падабаюцца, яна пабачыла свет у выдавецтве «Беларусь». Малюнкі дакладна дапаўняюць тое, пра што апавядаецца. Нібыта бачыш усіх герояў, пра каго гаворыць Альма. Яны так намаляваны, што сталі для дзетак адразу добрымі знаёмцамі. Гэта мастачка Віялета Жук пастаралася.

Мой сын з кніжкай некалькі дзён знаёміўся. Я ж прачытала яе, як кажуць, на адным дыханні, усё больш пераконваючыся, што гэта акурат тое, што дзецям і неабходна. Аўтарам, безумоўна, удала выбраны апавядальнік. Вядома, цікава, калі нешта расказвае сам пісьменнік. А тут пра розныя гісторыі прамаўляе сабачка — адна з тых, каго па праве мы лічым сапраўдным сябрам чалавека. Гісторыі, з якімі яна знаёміць, адна адной займальней. Першая называецца «Цюлень Цёпа — герой Крайняй Поўначы».

Як вядома, усе цюлені непаваротлівыя, а гэты такі, што нават мама, якая вельмі любіць яго, сярдуе: «Усё ў цябе не так, як у іншых». Праўда, у яго таты іншая думка: «Ніякі не недарэка сынок наш. Проста зусім маленькі яшчэ. Убачыш, з яго вырасце выдатны Цёпа». Праўду казаў ён. Усе загаварылі пра яго, як выратаваў белага мядзведзя. А ён жа «ў даўжыню ледзь не тры метры...» Усе яго баяліся, Тыранам Крайняй Поўначы называлі.

Толькі так было раней. Прайшлі гады, пастарэў ён. Аднойчы ніяк з палонкі не мог выбрацца, а поруч нікога. Ды каб і бачыў, што ён у небяспецы, наўрад ці паспяшаўся б дапамагчы. Адзін Цёпа, які быў побач, адважыўся. Падаў ён мядзведзю свой хвост і, хоць і з цяжкасцю, выцягнуў з палонкі. Пасля гэтага інакш сталі ўспрымаць Цёпу: «Яго пачалі называць героем Крайняй Поўначы. Асабліва радаваліся цюлені. Разумелі, што гэта гонар і для ўсіх іх».

У наступнай казцы — «На арэлях з сонечных промняў» — зусім іншая гісторыя. Нічога легендарнага, але тое, што адбываецца з героямі, вельмі шчымліва-кранальнае, нават забываеш аб тым, што перад табой браты нашы меншыя. Галоўны персанаж — вожык Шурок. Ён сам выбраў сабе такое імя. Мама хацела назваць яго Шнурочкам, паколькі заўсёды ходзіць за ёй, а яму спадабалася гэтае. Іншыя персанажы — кот Базыль, певень Паша, сабака Пірат. Здавалася б, ніякае сяброўства з імі немагчыма, аднак, аказваецца, яны як адна дружная сям'я.

Над вясковай хатай, каля якой жыў Шурок, у сонечны дзень праплывалі аблокі. Яму падабалася адно з іх: «Чаму — ён адказаць не мог. Як быццам яно было гэткае ж, як іншыя. І беленькае, і пушысценькае. Ды менавіта без гэтага воблачка яму станавілася так самотна, што месца сабе не знаходзіў. Хацелася з ім пазнаёміцца». Дапамог Пірат: ён завыў, а воблачка апусцілася ніжэй. Так Шурок і пазнаёміўся з той, пра каго марыў. Яе звалі Машай…

Не менш цікавая казка «Эх, запрэжка! Ды мышыная», якая, між іншым, «вырасла» з казкі «На арэлях з сонечных промняў». Кот Базыль таксама хацеў на іх пакатацца. Толькі з гэтага нічога не атрымалася, бо аказаўся такім цяжкім, што промні не змаглі яго падняць у паветра. Пасля кот задумаў насельнікаў двара па-свойму здзівіць. Прымусіў мышэй пакатаць па двары ў калясцы. Як гэта атрымалася, і расказваецца ў казцы.

Маленькія чытачы будуць у захапленні, пазнаёміўшыся з «"Птушачкамі» ў акварыуме» — так называецца яшчэ адна казка. Тут Ліза прызналася Альме, што яна «паэт у душы». Без маралізатарства, без дыдактызму аўтар даводзіць, як важна адчуваць у паўсядзённым жыцці, у наваколлі тое, што трапляе пад вызначэнні «вабнае» і «прыгожае». Гэта тое, з чаго і пачынаецца паэзія.

Шмат радасці прынясе хлопчыкам і дзяўчынкам і знаёмства з казкай «Скакунчык, ён жа Заяц — Плясь-Нага»!

Знаёмячыся з заключнай казкай «Як воўк Плакса ваўком Сябруком стаў», можна западозрыць Алеся Марціновіча ледзь не ў плагіяце. Многія ж памятаюць мультыплікацыйны фільм «Лагодны воўк», створаны на кінастудыі «Беларусьфільм» паводле аднайменнай казцы Алены Маслы, які стаў лаўрэатам Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад-2018». Кніга ж з ёй увайшла ў вучэбную праграму па прадмеце «Беларуская літаратура» для пазакласнага чытання. Толькі папрокі гэтыя марныя, бо, калі сабачка Альма пісала свой твор, ні пра саму казку, ні пра анімацыю нічога не ведала. Ды і калі ёсць ў іх падабенства, дык толькі ў выбары галоўнага героя. У астатнім жа…

Многае сведчыць аб тым, наколькі начытаная апавядальніца Альма і як у яе шмат сяброў. Прыклад — «Драбок Дарынка», у якой сабачка расказвае пра наведванне з дарослымі заказніка «Званец», што знаходзіцца на тэрыторыі Драгічынскага і Кобрынскага раёна. Яны пабывалі ў драгічынскай частцы. Там Альма і напаткала адну з самых рэдкіх птушак з сямейства вераб'іных. Панавуковаму яе завуць вяртлявай чаротаўкай, а размоўная назва — птушачка-драбок. А Дарынкай Альма назвала яе пры знаёмстве. Яшчэ адну — Зарынкай, трэцюю — Заранкай…

Прыводзяцца ў казцы і звесткі, якія дзеці не ўсюды атрымаюць. Напрыклад, такія: «<…> вяртлявай чаротаўцы неабходны нізінныя балоты, багатыя разнастайнай расліннасцю. У "Званцы" іх вельмі шмат. Таму чаротаўка і згадала "Званец". У гэтым заказніку пражывае блізу 27 працэнтаў з той колькасці чаротавак, што ёсць на ўсёй Зямлі. Увогуле ж у Беларусі іх, чаротавак, каля 43 працэнтаў».

Кніжка цікавая не толькі сваёй пазнавальнасцю, але і даходлівасцю выкладання матэрыялу. А яшчэ, што вельмі важна ў творах, адрасаваных дзецям, тым даверам, з якім аўтар звяртаецца да чытачоў. Правільней, сама сабачка Альма, якая дзеліцца сваімі ўражаннямі, развагамі і вельмі радуецца, калі штонебудзь у тых, пра каго яна расказвае, атрымліваецца. Яна яшчэ спадзяецца сустрэцца з юным чытачом.

Хто ведае, калі яна прадоўжыць гэтую кнігу. Котка Ліза любіць пакпіць з Альмы, і мне здаецца, што яна, пазнаёміўшыся з гэтым гісторыямі, усміхнулася: «Пакуль, Альмуша, ты будзеш думаць-гадаць, сама возьмуся сваю кніжку пісаць». Што ж, застаецца пачакаць, хто з іх першы спраўдзіць абяцанае.

Сняжана РУДНІК

Усе добрыя панчохі трапляюць у рай

Героі новай кнігі вядомай дзіцячай пісьменніцы Жанны Міус камусьці могуць падацца незвычайнымі, нават дзіўнымі, кагосьці могуць і напалохаць. Аднак смела можна сказаць, што казачніца мае надзвычайную фантазію. Галоўныя персанажы казкі «Панч і Чоха» — вырабы панчошна-шкарпэтачнай фабрыкі.

Жанна Міус, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, добра вядома беларускаму чытачу, а асабліва маленькаму. Як дзіцячая пісьменніца яна мае неабходную якасць — багатае ўяўленне, што мноства дарослых губляюць. Праблемы, праца, меню на вечар забіваюць дарослыя галовы, не пакідаючы прасторы для роздумаў. А сапраўдны творца тым і вылучаецца, што яго наіўная фантазія спалучаецца з дарослай адказнасцю і цярплівасцю ў выкананні задумы.

Новая кніга пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда», што з'яўляецца працягам супрацоўніцтва дзіцячай пісьменніцы і ўстановы. Мастаком незвычайнай, эксперыментальнай кнігі стала Святлана Стахоўская. У афарміцельніцы атрымалася стварыць стракаты вобраз галоўных герояў, вясёлкавасць якіх і варта лічыць іх самым галоўным скарбам. Хоць з першага погляду цяжка зразумець, што за істоты атачаюць бэзавалосую дзяўчынку на вокладцы.

Панч і Чоха — вясёлыя панчохі яркага вясёлкавага колеру. Яшчэ на фабрыцы іх аб'ядналі ў пару, тым самым зрабіўшы неразлучнымі. Сябрам давядзецца прайсці праз шматлікія выпрабаванні лёсу.

Кніга падзелена на невялікія раздзелы, кожны з якіх мае сваю дасціпную пазітыўную назву. Напрыклад, загаловак раздела, у якім распавядаецца пра з'яўленне незвычайных панчох «Я прыгожы! Я вясёлы! Я жыву!» гучыць як сапраўдная афірмацыя, сцвярджэнне, да якога варта звяртацца ўсім, хто хоць нейкім чынам у сабе сумняваецца.

Раздзел «Хай вас шчасце вязе на найлепшай назе» апавядае цудоўную і кранальную гісторыю сустрэчы Панча і Чохі з іх будучай уладальніцай — той самай дзяўчынкай з бэзавымі валасамі. Завуць яе Яна, альбо Яначка, і яна па праве можа быць гаспадыняй такіх яскравых панчох. Уся натура яе выпраменьвае такія ж святло, пярэстасць і вясёлкавасць.

Разам з Яначкай панчохі перажываюць самыя розныя, вясёлыя і небяспечныя прыгоды. Пабываюць яны і ў пашчы пыласоса, і ў зубах злоснага нявыхаванага сабачкі Плю, а таксама даведаюцца, што такое спа-працэдуры па-панчошнаму. Самае галоўнае, што дазволіць сябрам заўсёды знаходзіць выхад з любой сітуацыі, — неразлучнасць.

Немагчыма не заўважыць мову, якой напісана казка. Жанна Міус смела і трапна выкарыстоўвае актуальныя выразы, словаўтварэнне і гульню слоў. У выніку гэта не абцяжарвае тэкст, а дадае яму фарбаў і аўтэнтычнасці.

Такі падыход дапамагае маленькім чытачам не толькі пазнаёміцца з цікавай гісторыяй, але і папоўніць сваю лексічную скарбонку новымі выразамі, якія ўзбагацяць любую гаворку.

Кніга адрасуецца чытачу школьнага і дашкольнага ўзросту.

Валянцін САЛОМА

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ
Светлагорск

Доўг

(са зводу паэм «Вучань вечнасці»)

Я сам сабе нейк дапамог
святую праўду скеміць:
жыццё ўсё — абавязак, доўг, —
яго патрэбна здзейсніць.
Жыць скрозь, каб жыць? А як, чаму?
Жыве ж люд проста, будна.
Я гэтаксама ем і п'ю,
ды ў свет з'явіўся, каб саму
якуюсь вызнаць сутнасць.
Ёсць высі, далечы знаццё —
душа ў сябе іх цягне…
Без гэтай сутнасці жыццё
мне бессэнсоўным стане.
Яно тады — жывая смерць.
Бывае смерць жывая,
калі не думаць і не смець,
а проста есці, піць хацець,
не цяміць дух адчаю.
Не адзывацца і не зваць,
зямных вякоў не помніць…
Няўжо ж усім свой доўг спазнаць
больш цяжка, чымся споўніць?!
Аднак у чым ён або ў кім?
Так проста і не скажаш,
ды ведаю: не толькі ў тым,
сябе чым абавяжаш.
Не абяцанне ў рэшце рэшт
і не зарок мо дзёрзкі,
а нейкі вышні горды свет —
у прызначэнні Боскім.
Я помню, як прасіў Яго, —
і дух мне асвяціла,
уважыла і на мяне сышло —
дабраславіла.
На шлях, што творыць сам сябе,
Яго дабраславенне:
набыць у слове трэба мне
сваё ўсё ж прызначэнне.
Уцяміць і дыханне нат
сэнс выніку зямнога:
паэзія — палёт, яна
для выканання доўгу.

А слову і паветра — грунт,
бязважкая ўсё ж важкасць…
Скажу сябе я громам тут,
так, громам — праз ціхмянасць.
Стаіўся ён сярод яе?
Прыкінуўся, бы ў змане?
Яшчэ ўва мне, ужо ўва мне,
а я сказаць — не ў стане.
Якімсьці гукам не гатоў,
не словам, а гучаннем, —
яшчэ не воклік — толькі зоў,
адлегласці чаканне.
І зноў дыханнем у адказ
крану нячутнасць гуку…
Міг нібы ўспыхнуў і пагас,
пагас у сэрца стуку.
Ці ўсё-такі застаўся ў ім?
Сэрцабіццё стрымаю…
Усё ўяўленне аб усім, —
як я скрозь уяўляю.
Не дні з жыцця — жыццё ўжо з дзён,
а смерць сама ў магіле,
і сіла — ў слабасці маёй,
а слабасць — існа ў сіле.
Я знаю, што пагаслы міг, —
ён са святлом яднанне,
а вось сучаснікаў маіх
бы і няма дазвання.
Якая справа мне да іх?!
Згарэў і новы ўспыхнуў міг.
А я, о Госпадзі, а я
на ўсё гляджу праз дальнасць…
За чысцінёй жыцця-быцця
ёсць вышняя рэальнасць.
Я веры розумам хачу,
а розуму — зноў верай.
Я ціцынёй ужо маўчу,
хаця і стала шэрай.
Любы знікае ў шэрым бляск —
туманна без туману…
Доўг — самалюбству ўсё ж адказ,
а ў праўдзе — сутнасць зману.
Чый голас хочацца забыць?
Чутно і праз стагоддзі:
«Людзей не зможаш палюбіць,
ад іх чакаючы чагосьці…»
Як доўга ў шэрым пустата
зноў доўжыла маўклівасць…
«Быць памяркоўным у гадах —
ці ж то не справядлівасць?»
Адказу голас папрасіў —
і вось чакае следам,
але ў мяне не толькі сіл —
няма і дум на гэта.
Так, для сябе, — не для кагось, —
душы ўжо даўшы волю,
любіць, даруючы ўсё скрозь,
ці дараваць любоўю.
Бы адступае ўвесь прастор,
а памяць, бы расплата, —
і вось бальнічны калідор,
бальнічная палата.
Лаўлю губамі ўдых ізноў,
а ён усё знікае,
і надта блізкая ўжо столь
дыханню замінае.

Гадзіннік? Капанне вады
у нейкім чуйным кране?
Я не хачу яшчэ туды,
куды ўсім лёсам цягне.
Тунэль, дзе мклівы чорны вір —
асэнсавання сіла…
Трымае шчэ дыханне міг,
а воля — адпусціла.
І крык — не крык, дых заняло,
адлегласцей — ніякіх,
ды льецца зыбкае святло
з адзенняў бела-яркіх.
Перамагло дыханне страх,
і зноўку цела — ў целе…
Зноў той жа вір… Зваротны шлях
у мклівістым тунэлі.
Пасцель бальнічная, абраз,
а столь вышэйшай стала…
Я знаў, што паміраць не час, —
жыццё вярнула ява.
Зірнуў удзячна ў сіняву…
Мо смеласці — залішне:
ёсць тое шчэ, пакуль жыву,
што я зрабіць павінен.
І трэба ўсё-такі змагчы,
хоць смерці памагаю:
зрабіўшы, толькі вось тады
я і памру, — я знаю.
То вынік жорсткасці крутой?
Не, міласнасць мне дорыць…
Жыццё маё цяпер — як доўг,
яго павінен споўніць.
Саромяць зоркі кожны раз,
бы вочы высі вешчай.
Плён працы ўжо не напаказ —
за славай чалавечай.
Што слава?! Скрозь самападман…
Зноў высь напамінае:
«Амін, амін, — кажу я вам, —
моц толькі плата мае…»
Ці папярэджанне, ці зоў?
Хто чуе, — тыя знаюць…
А там, дзе звышбагата слоў,
і думкі ўсе знікаюць.
Хачу і не магу забыць,
а словы не фальшывяць,
што трэба грэшнікаў любіць,
іх справы ненавідзець.
Таксама доляй грэшны ўсёй
па выніках-аблогах
і перад маці я сваёй,
і — хто быў болей чым раднёй,
а больш за ўсё — прад Богам.
Бацькоўскі доўг, сяброўскі, — ён
для выніку недарма.
А прад сабою, ды здавён,
няўжо не доўг таксама?
Зарок? Прызванне век-вяком?
Я сам прасіў зароку.
І вось жыву ў святло святлом —
святлу навідавоку.
А там, дзе век для веку — госць,
дзе думкі ў змрочнасцях няцямкіх,
факіры амярцвяюць плоць,
цнатлівасць берагуць вясталкі.

Там дзесьці даўні Індастан,
а ў ім — суровыя браміны
зарокамі эпіталам
сабе ж сябе забаранілі.
На прывязі ўвесь час жывуць,
ад дрэў сваіх — ні кроку,
ці над агнём ляцяць, імкнуць
кастры крануць звысоку.
Або груз цягнуць ланцугоў
ад Бога ці да Бога, —
ідуць не з нішчаю душой,
здрабніўшы ў пыл дарогу.
Там быць забітым ці забіць —
падкажа доўг дуэлю…
Аб тым не варта гаварыць,
ды я нат і не ўмею…
Там гордасць грэкаў або рымлян,
арабаў чэсны фанатызм,
там флібусьераў прагна склікан
звышрадасны патрыятызм.
Ды так і ў нас, дзе готы, гуны,
драўляне і дрыгавічы,
дзе анты, русы або укры…
Дзе Рурык… Чую: «Замаўчы!..»
Мне голас мой не дазваляе
напаўпрызнаннем гаварыць,
калі ці ўсё нат Нестар знае
або нейк хоча затаіць…
Славяне-русы, Візантыя,
і Калакір, і Святаслаў,
і — Уладзімір… Русь… Расія,
дзе ўжо свой свет агульным стаў.
Васілій, Вітаўт, Едыгей
ды князь Іван ужо вялікі,
хто першым і адчуў вярыгі
Русі з усіх яе падзей.
А там — доўг поля Кулікова…
Паветра часу ёсць любога
і беспаветранасць жа ёсць…
Але прамовіцца ўжо слова
не смее неяк мімаходзь,
бо засталося ўласным доўгам, —
імя хай скажа за сябе…
Князь Ігар і княгіня Вольга,
Алег… Скрозь доля ў барацьбе…
А доўг — не ў тэрмінах-эпохах.
Пасля жыцця — таксама доўг…
Зноў Рускі помніцца Храналаф —
ён перашкодзіў ці памог?
Хіба пра гэта думкам скажаш?
Змаганняў-згадак — каламуць.
Доўг — чым сябе ты абавяжаш,
сабе што мовіш, не камусь.
Яго, не палюбіўшы, споўніць,
напэўна, немагчыма, не.
Ну вось і поўнач, вось і поўнач, —
час мерна слізгае, імкне
па мне, па вокнах і па сценах,
і ціш нервовую ўжо тне, —
цячэ ўжо нават ён па венах
ва мне.
Вось вечнасць, уздыхнуўшы, ўспомню…
Ах часе-час, зноў пачуццё,
што мо жыццём свой доўг я споўню,
ці споўніць ён маё жыццё.

Пераклад з рускай Соф'і ШАХ

Аляксандр БЫКАЎ
Мядзел

Трэці снег

Толькі той, трэці снег,
што пасля марозу,
трывала ляжа.
(З народнага)

Быццам з нябесных прарэх,
Пасля марознага ўбору,
Трэці пасыпаўся снег,
Што асвятляе прастору.

І, пасярод цішыні,
Сам я сабе прамаўляю:
Сэрца маё, ты прымі
Стрыманасць белага раю.

Бо ці патрэбны мы дзе,
Як пасівелі ўжо скроні?!
Вёрткай сінічкаю дзень
Скокне мне на падаконне.

Нам яшчэ разам трываць.
І мо не горшы занятак:
Трэцяга снегу счакаць —
Проста,
каб кінуць зярнятак!

У жнівеньскі вечар

Нешта сонца пайшло ўразнос,
Бы пакрыўдзілі яго нечым.
Прахалоды ізноў не прынёс
Гэты жнівеньскі ціхі вечар.

Толькі ўсё на кругі свая
Хутка верне восень дажджамі.
І закрыемся мы спакваля
Парасонамі і плашчамі.

Сумна ляжа на дол лісцё,
Туманы наляцяць і слота.
Пакуль сонца — датуль і жыццё.
Пакуль сонца — неадзінота!

Фота Кастуся Дробава.

Мядовы Спас

Тут, дзе сягаюць шляхі да Вільні,
Жнівень гарачы неба спаліў.
Гэтага краю мы не пакінем —
Зноўку смакуем белы наліў.

Мо і не так што ў жыцці зрабілі,
Ды не забыцца сцяжын, што прайшлі.
І чырванеюць вунь арабіны,
Быццам сумленне і кроў зямлі.

Ціхі і мройны жнівеньскі вечар,
Што дакляруе ён новаму дню?
І не пазбегнуць тугі спрадвечнай,
Бо сэрцам радзіму ўспрымаем сваю.

Край дарагі, мы табе замовім
Долі найлепшай без гучных фраз.
Тут і надзеі, тут і любові
Выратавальны Мядовы Спас!

Яблык з лецішча

Студзень, куды меціш ты?
Ну, падай хоць знак.
Яблык мерзлы з лецішча —
Як ён сёння ўсмак!

З лета прамінулага
Дачакацца змог.
І душу заснулую
Будзіць незнарок.

Бывай, зіма! Ідзе вясна! Вясне — дарогу!

Лірычныя замалёўкі

Раіса ДЗЕЙКУН

Гомельскі раён

Крыгаход на Сожы

З домам, дзе я жыву, Сож знаходзіцца, можна сказаць, побач. Зімой, калі маразы скавалі яго ў ледзяны панцыр, я нават спускалася ўніз і асцярожна, прабуючы кожны крок, заходзіла на сярэдзіну ракі. Мне хацелася паглядзець навокал менавіта з ракі, а не з моста, па якім ездзіла туды-сюды ў Гомель і назад. Краявіды, я вам скажу, былі казачныя.

Але вось вясновае сонца зламала лёд ракі. Я стаяла на мосце і глядзела на льдзіны, якія, быццам белыя жураўлі, плылі па роўнядзі вады. Я не адчувала суму расставання, такога, які апаноўваў мяне восенню, калі ў вырай адляталі сапраўдныя жураўлі. Тых я праводзіла са смуткам і жалем, а гэтых — ледзяных — з радасцю, бо следам за імі ішла вясна.

Лясны жарт

Мусіць, і да дрэў дайшло ўжо, як мы, людзі, бярозу славім. Яна, аказваецца, самае паэтычнае дрэва. З кім толькі яе не параўноўваем: з дзяўчатамі-прыгажунямі, з нявестамі, з царэўнамі, з белымі лебедзямі, са свечкамі і нават з партызанскімі сёстрамі… Памятаеце:

Ой, бярозы ды сосны,
Партызанскія сёстры…

Не злічыць, колькі паэтаў яна натхніла на сваё ўслаўленне? А кампазітараў? А мастакоў?

Бярозы, ды бярозы!

Вось неяк сосны, што таксама ўслаўляліся, але не так часта, відаць жа, пазайздросцілі сваім беластволым сёстрам-красуням і таму вырашылі з іх пажартаваць. Яны надумалі хоць ненадоўга, пад канец зімы, прыхарашыцца пад бярозы.

Як толькі заварочалася, закідалася, мусіць, ужо апошнім снегам завіруха, сосны і давай лавіць вялікія пялёсткі-сняжынкі. Налавілі і абляпілі-закрылі белымі плямамі свае ствалы. Стаяць гонкія, стройныя і… плямістыя.

Я пабачыла іх па дарозе на Хойнікі. Што за насланнё? Вось жа за акном аўтамабіля мільгаў бярэзнік, а тут у вочы кінулася незвычайная карціна: вершаліны ў дрэў зялёныя — вершаліны сосен, а ствалы стракатыя — нібы ствалы бяроз.

Жарт, дый годзе! Аказваецца, прырода, як і чалавек, таксама ўмее жартаваць. А я незнарок узяла ды і падгледзела яе жарт.

У прадчуванні вясны

Добра, калі ты з лыжамі ў згодзе — гэта робіць шлях па лесе асабліва захапляльным. А лес? Ён тут як тут — адразу за агародам нашага селішча: направа пойдзеш — да чыгункі выйдзеш, налева павернеш — у вялікі лес заглыбішся. Паварочваю налева: зіма вось-вось пачне здаваць свае пазіцыі вясне. Калі яшчэ ў гэтым годзе выберашся на лыжах у лес — лес дзяцінства і маладосці?

Першымі на шляху паўстаюць сосны. Яны мае даўнія знаёмыя, можна сказаць, нават хрэсніцы, бо некалькі дзесяткаў гадоў назад падчас школьнай практыкі мы садзілі іх малюсенькімі на пустой у той час дзялянцы пад кіраўніцтвам (нябожчык ужо) ляснічага Афанасія Пятровіча Дземчанкі, які вёў у нашым дзясятым класе лесаводства. Колькі такіх дзялянак ён пакінуў пасля сябе! Удзячная прафесія — лесавод!

Ого-го, якія вымахалі! Перад імі раскінуліся прасторныя бела-блакітныя палотны снегу. Снег — і зялёнае! Быццам лета ў зіме! Ды толькі за гэта адно дзіва мы павінны глядзець цёплымі і ўдзячнымі вачыма на сосны. У іх такая незвычайная краса, асабліва прыкметная зімой. А які пах ідзе ад іх кары, ад шышак, ад ігліцы!? Не надыхацца!

За соснамі паказаўся гурт танкаставых клёнаў. Тыя яшчэ лясныя красені! Асабліва восенню, калі іх лісце жаўцее і чырванее-палыхае — тады дрэвы нагадваюць гіганцкія букеты. Наогул, тут, ва ўрочышчы Будзішча, клёнаў даволі многа. Дзень выдаўся ціхі і сонечны, і ад клёнаў на снег адкінуліся вялізныя цені — халодныя, з блакітным адлівам. І тут маю ўвагу захапілі нейкія незразумелыя празрыстыя пласцінкі на снезе. Не, нават не пласцінкі. На першы погляд здалося, што нейкі лясны чараўнік раскідаў па снезе сухія крылы стракоз. Пад сціплымі промнямі зімняга сонца яны адлівалі золатам. І колькі ж гэтых крылаў! Ды што ж гэта такое? Што за цуд такі на маім шляху?

Падышла бліжэй, прыгледзелася да тых страказіных крыльцаў. Ды не, не яны! Нагнулася і падняла некалькі. Толькі потым распазнала што гэта за «крыльцы». Гэта было насенне клёнаў — бледна-жоўтае, лятучае!

Падумала пра сябе: усё правільна прадугледзела матухна-прырода — прыйдзе вясна, адны крыльцы клёнаў апусцяцца разам з талым снегам на зямлю, а іншыя разнясуцца ветрам і ручайкамі ў іншыя мясціны. І там, дзе яны крануцца зямлі, праб'юцца парасткі новых дрэўцаў.

Вось ён — рух да вясны, да будучыні!

Воля

Я падымалася з нізіны. Усю яе перасякалі ручаі, маленькія і большанькія — адзін на аднаго не падобныя. Кожны з іх, як мог, выбіваў-прабіваў сабе дарогу і складаў сваю асабістую песню, нешта бубніў.

Імкліва бягуць веснавыя ручаі. Спяшаюцца. Куды? Можа, у другі ручай ці ў малую рэчку або вялікую? Або нават у мора? Ды не! Кожны марыць, кожнаму хочацца трапіць у акіян. Толькі так. Гэта дае сілу і нараджае песні, не падобныя адна на другую…

Толькі я мінула ручаі-летуценнікі і стала падымацца на ўзгорак, як збоку рэзка ўскінулася калматая галінка сасны. Першая здагадка была, што гэта не інакш, як нейкая птушка сарвалася, пабачыўшы мяне. Але колькі я ні ўзіралася па баках, ніякай птушкі не было. І наогул, вакол стаяла цішыня. А галінка разгойдвалася. Што б гэта значыла? Прыпынілася, агледзелася. Зверху на галінцы ляжала крышку снегу. Пад сасною таксама была купка снегу, не большая за шапку.

Тады толькі да мяне дайшло, я зразумела: да сасновай галінкі прыйшла воля. Яна адтала ад снегу і вырвалася з доўгага зімовага палону.

Яшчэ адно дрэва ў лесе

На невялічкім узгорку перад палянай пабачыла сасонку. Была яна ў мой рост, але на ёй ужо ўтварылася чатыры паверхі галінак-ярусаў. Верхні паверх — зорачкай, а яшчэ вышэй — толькі стволік. Сасонка такая маладая, што паміж трэцім і чацвёртым паверхамі і на вершалінцы проста са ствала смешна выходзяць іглінкі, па тры з кожнага гнязда. Заканчвалася яна вершалінавымі адростачкамі.

Вось і яшчэ адно дрэва ў лесе. Чамусьці падумалася, што не можа быць, каб я пайшла ад прыгажуні сасонкі, сваёй новай знаёмай, проста так. Ну штосьці ж павінна здарыцца ў падзяку за маю ўвагу.

Так і выйшла, як я загадала сабе: невядомыя мне птушкі заспявалі зусім блізка. Здалося, што адна давярала сакрэт другой:

— Піў… піў… піў…

А цікаўная сяброўка дапытвалася:

— Чым-чым-чым?

І тут над пляткаркамі ўзнёс свой голас салавей.

Будаўнікі

Гракі з'явіліся нечакана: раніцай выйшла на ганак, а па садзе-агародзе, якраз па сунічнай градцы, ходзяць-разгульваюць госці з выраю. І такія паважныя, у доўгіх чорных сурдутах. На мяне — нуль увагі, быццам яны тут гаспадары, а я так, збоку прыпёку. Доўгімі дзюбамі штосьці клююць-дзяўбуць. Прыгледзелася, а яны, аказваецца, шукаюць штосьці якраз усярэдзіне сунічных кусточкаў. Няйнакш сарцавіну ягадніку знішчаюць. Разглядвалася, шуганула голасам і запляскала ў далоні. Нехаця падняліся хто куды: на дрэвы яблынь і сліў, на дах суседняга дома, на бярозы і таполі, што стаялі трохі далей, каля дарогі.

Кожны ранак карціна паўтаралася. Потым я з імі звыклася і перастала звяртаць увагу. Аказалася, да надыходу цяпла. Як толькі яно стала адчувацца ў прыродзе, мае гракі, якія дагэтуль будаваліся, але чамусьці вяла, у замаруджаным тэмпе, як з той гradкі сунічнай сарваліся. Калі прыгледзелася больш уважліва да сваіх пярнатых суседзяў, аказалася, што будаўніцтва грачынай «вёскі» на старой бярозе, высокай і галіністай, у самым разгары.

Дамоў-гнёздаў я налічыла дзевяць. Усе яны былі розныя. Адны — у ахапку не ўтрымаеш, а другія — з шапку. Вось адзін з гракоў апусціўся пад бярозу, нашчыпаў старой травы і ўзляцеў. Няйнакш гэта грачыха. У другога грака — ні даць, ні ўзяць — мужчынская хватка: нясе аднекуль цэлую тонкую і доўгую лазінку. Як жа ён дабярэцца-прадзярэцца з ёю да свайго гнязда праз густыя бярозавыя галіны?

Не згледзелася, як ён ужо ўкладваў, увіваў тую галінку ў гняздо. Потым узняўся і зноў у рэйс. Відаць, што гэты грак сапраўды майстар-будаўнік, і гняздо ў яго вялікае, прасторнае. Гаспадар.

А другіх гракоў грачыхі гоняць з «селішча», крычаць на іх, дзяўбуць нават. Мусіць, лядашчыя…

Далёка відаць старую бярозу і на ёй грачыную, чорную, як самі гракі, «вёску».

Навагоднія адчуванні

Таццяна БАРЫСЮК

Мінск

Пачынаць трэба спачатку, напрыклад, з дзяцінства. У двары было снегу так шмат, што гэта былі снежнае мора, снежныя лавіны, снежныя горкі, па якіх я неслася на драўляных санках з рознакаляровымі папярочнымі ашэсткамі і спінкай, на металічных палазах. Ух! Ляціш з горкі — аж дух захоплівае! Першапачаткова накіроўваеш у той бок, каб не ўляцець у плот ці ў нечую машыну. Дзякуй Богу, праезная частка была далёка. Ляціш сабе — і ніякіх клопатаў. Хатняе заданне нескладанае — «справімся!», бацькі накормяць і апрануць, настаўнікі ў меру добрыя — «Сусвет клапоціцца пра мяне!» Дадому прыходзіш мокрая ад снегу, з палаючымі ад шчасця вачыма і з чырвонымі ад марозу шчокамі.

Там мяне чакае навагодняя яліна ў яркіх цацках. Сама ж прыбіраць маме дапамагала. З залатой зоркай на верхавіне. На стале — мандарынкі пахкія, духмяныя ў фіялетавай шкляной місачцы. Мама прынесла з крамы бананы недаспелыя — яны ляжаць у дзіцячым футры каля батарэі. Аж няўсцерп — так хочацца іх хутчэй расчахліць і з'есці, нягледзячы на тое, што цвёрдыя і зеленаватыя! Мамачка любімая не забывае цукерак шакаладных на яліну павесіць — як быццам цацкі, але да таго ж ядомыя! Эх, добра, што мама і тата жывыя, маладыя і вясёлыя!

Ух, неяк праляцелі дзяцінства, юнацтва, маладосць і — опанькі — 51 год! Тры шлюбы ў мінулым. Два сыночкі — як медалі за адвагу. Ух! Ім ужо 26 і 16 гадоў! Ужо лянота ставіць яліну. Мандарыны і цукеркі купіла, а навагодні настрой уключыць забылася. Прасіла ў Дзеда Мароза кавалера надзейнага, вернага, прыгожага, высокага да Новага года — так, відаць, на ўсіх такіх якасных не хапіла. Добра. Што рабіць? І ці ёсць у жыцці шчасце?

З зімовых радасцей — любімае футра бела-бэжавае, штучнае. Глядзіцца як на зорцы Галівуда — клас! Да яго чорныя высокія скураныя боцікі на невялікім абцасе, чорныя пальчаткі са штучным мехам па версе. Валасы доўгія светла-русыя распусціла па плячах! Проста дзіва! І не скажаш, што 51. 30? Не, хутчэй 35. Жудасць! А мужчынам падавай 20—25. Ды Бог з імі, з мужчынамі. Іншыя дамы вытарашчваюцца на мяне: «О-о-о-о-о, яна цэлых тры разы замужам была! Хопіць ужо з яе! Некаторыя да гэтага часу ў дзеўках!» Разумею, дзяўчаты. Бог няроўна дзеліць. Вам па вашай карме будзе. Ці не будзе. Усё роўна ўсе памром. Настрой сапраўды не навагодні!

Я ўдзячная Богу, што ў мяне ёсць гэтае жыццё. Што ў ім бываюць цуды і незвычайна-трапяткія прадчуванні, хаця бпад Новы год. Калі чакаеш, што пасля Новага года нарэшце станеш шчаслівай і дазволіш сабе здзейсніць свае мары. Аб казачным прынцы на белым кані. І ён нарэшце зразумее, што марыў пра мяне ўсё жыццё. Або хаця б напіша ў «Фэйсбуку», што сумуе і хоча пабачыцца.

51 год праляцеў, як адзін з'езд на санках з гары. Яшчэ адзін з'езд — і скончыцца песня навагодняя. І сустрэнуся з бацькамі — ля яліны прыбранай, пад пах мандарынак і выццё ветру за акном. І ўсё паўторыцца. Душа папросіцца ў свет. Дзе снег, і мароз, і надзеі…

Паштоўкі-квэсты

Актуалізацыі звароту да жыццяпісу і творчай спадчыны таго ці іншага пісьменніка могуць паспрыяць розныя фактары: юбілейныя, памятныя даты, зробленыя знаходкі і інш. 1 верасня мінула 90 гадоў з дня сыходу з жыцця Уладзіміра Жылкі (1900—1933), аднаго з найбольш яркіх спадкаемцаў Максіма Багдановіча.

Жыццёвыя шляхі вялі прадстаўнікоў розных пакаленняў у адзін час у розных напрамках. Ратуючыся ад ваеннай навалы, сям'я Жылкаў разам з хваляй бежанцаў перабіраецца ў Тульскую губерню. У верасні 1916 г. пясняр чыстай красы едзе з Яраслаўля ў Мінск.

У фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры захоўваюцца дзве паштоўкі, якія перадала ў 1989 г. разам з некаторымі іншымі дакументамі з сямейнага архіўнага збору Наталля Лазарава, дачка Уладзіміра Жылкі, настаўніца з Полацка. Цікавыя яны найперш тым, што, невядомыя спецыялістам і шырокай аўдыторыі, асвятляюць найбольш ранні, «дапісьменніцкі» перыяд жыцця паэта. Разам з некаторымі матэрыяламі з фондаў Літаратурнага музея М. Багдановіча, Дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва яны запачаткоўваюць своеасаблівы эпісталярна-біяграфічны дыскурс.

Перад намі дакументы, якія задаюць пытанні, разбураюць некаторыя стэрэатыпы, адкрываюць прастору для далейшай даследчыцкай дзейнасці. Чытачам «ЛіМа» прапануецца своеасаблівы квэст, а не завершаны вынік атрыбуцыі: параўнаць пераклад з арыгіналам



З фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Адваротны бок паштоўкі з віншавальным тэкстам Уладзіміра Жылкі. 1912 г.

на паштоўках, спраўдзіць дату і месца напісання, далучыцца да асвятлення некаторых старонак жыццяпісу У. Жылкі. Дзве паштоўкі — дзве весткі з мінулага — не толькі знаёмяць, але і заклікаюць да разваг, супрацоўніцтва, пошуку.

Вестка першая, віншавальная

Найбольш ранняя паштоўка Уладзіміра Жылкі адрасавана яго маці — Таццяне Ануфрыеўне. Можна сцвярджаць, перад намі першы (!) захаваны рукапіс будучага паэта. Аўтару 11 гадоў. Дзіцячы почырк, старанна выведзеныя акруглыя літары.

Сціслае віншаванне, паводле паштовага штэмпеля, адпраўлена на станцыю Гарадзея, у вёску Макашы Мінскай губерні 12 студзеня (?) 1912 г. (пераклад з рускай):

Дарагая мама.
Віншую вас з днём Анёла і жадаю ўсяго добрага.
Ваш Валодзя.

Пад тэкстам і зверху яго — прыпіскі іншым почыркам: «Маруся і я далучаемся і ад душы віншуем»; «Пішыце — 3 месяцы чакаю лістоў». Подпіс разабраць складана, але выкажам меркаванне, што гэта рука Юрыя Раманейкі, брата Таццяны Ануфрыеўны, які заўсёды апекаваўся сям'ёй сястры, цікавіўся лёсам і творчасцю пляменніка. Марусяй звалі яго жонку. Паштовы штэмпель указвае на месца адпраўкі карэспандэнцыі — «Шанцынов» (?). Дакладна вядома, што ў першай палове 1920-х гг. Юрый Раманейка жыў у розных гарадах Украіны. Пра гэта сведчаць яго лісты, што захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архівемузеі літаратуры і мастацтва. Не выключана, што Уладзік на час адпраўкі віншавальнай паштоўкі гасцяваў у свайго дзядзькі.

Вестка другая, абітурыенцкая

Паводле існуючых біяграфій У. Жылкі, у 1914 г. ён скончыў гарадское вучылішча ў Міры. У фондах БДАМЛМ захоўваюцца лісты брата паэта да Уладзіміра Калесніка. Барыс Жылка пісаў 13 красавіка 1969 г.: «Мір быў бліжэйшым мястэчкам, куды ездзілі на кірмаш з Макашоў, Гарадзеі і з Падлесся. Ну і там было гарадское чатырохкласнае вучылішча. Гэта было самае бліжэйшае месца, як гандлёвае, так і навуковае ў сялян таго часу гэтай мясцовасці». Пра далейшыя ступені адукацыі чытаем наступнае: «У Багародзіцк Валодзя паехаў таму, што там былі лепшыя ўмовы, а гэта было самае галоўнае, як у Мар'інай Горцы і Горках. Ніякіх знаёмых і родных там не было».

Другая паштовая картка, якая захоўваецца ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, прымушае перагледзець некаторыя жыццяпісныя звесткі пра паэта. Паводле адных сучасных біяграм, У. Жылка скончыў два класы Багародзіцкага сельскагаспадарчага вучылішча ў 1917 г. У іншых крыніцах за адлік часу навучання бярэцца 1914 г., адпаведна, курс здабыцця прафесійных ведаў прыпадае на 1914/1915, 1915/1916, 1916/1917 вучэбныя гады.

Выяўлены намі ліст дае зусім іншую інфармацыю. Поўная дата на паштовым штэмпелі хоць і не чытаецца дакладна, але год распазнаецца. З вялікай доляй упэўненасці можна сказаць, што 1916-ы. Пры гэтым у самім тэксце ліста гаворка ідзе пра паступленне ў Багародзіцкае вучылішча (паштоўка акурат з яго выявай). Адпаведна, заняткі маглі быць толькі ў 1916/1917 годзе і ў першай палове наступнага (у снежні 1917-га сям'я ўжо была ў Мінску).

І яшчэ адна нестыкоўка з вядомай біяграфіяй паэта, паводле якой у 1916 г. радзіна Жылкаў, ратуючыся ад вайны, перабралася ў Тульскую губерню. Барыс Жылка ў адным з лістоў да Уладзіміра Калесніка пісаў, што ў бежанства яны адправіліся з набліжэннем фронту, г. зн. у 1915-м, і не ў Тульскую губерню, а ў Калугу. Магчыма, гэты горад быў першым пунктам прызначэння.

Цяпер звернемся да тэксту ліста на адвароце паштоўкі. Яна адпраўлена бацьку будучага паэта на адрас: г. Мінск, Саборная плошча, царкоўна-начынны склад, Адаму Восіпавічу Жылку (пераклад з рускай):

Дарагі татачка!!!

У пятніцу ў нас была дыктоўка і задача, а ў суботу Закон Божы, геаметрыя і фізіка. Як задача і дыктоўка не ведаю, але Закон, геаметрыя і фізіка прайшлі вельмі добра. Сёння падрыхтоўваюся па геаграфіі на панядзелак. Дай Бог, каб хоць апошні прайшоў так, як першыя, то было б добра і мог бы спадзявацца, што паступлю. Пакуль што жыву ў адной гаспадыні. Плачу па 50 кап. за суткі. Калі паступлю, то адразу ж найму кватэру. Калі што будзеце пісаць, то пішыце: г. Багародзіцк, Тульская губ. Паштамт, да запатрабавання, Жылка.

Да пабачэння. З любоўю да Вас Валодзя.

З ліста вынікае, у 1916 г. бацька не быў разам з усёй сям'ёй у бежанстве, а застаўся, магчыма, часова, у Мінску. Таксама верагодна, што на радзіму (не ў вёску, а ў горад) ён вярнуўся раней за ўсіх астатніх для папярэдняга ўладкавання побыту.

З аграномаў — у паэты

Гісторыя Багародзіцкага сельскагаспадарчага вучылішча самым цесным чынам звязана з імем яго заснавальніка і апекуна — прафесара Івана Сцебуна (1833—1923), а праз яго — і з… Беларуссю. Будучы вядомы вучоны-аграном у 1854 г. скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут (цяпер Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія). Пасля вывучэння вопыту ўзорных гаспадарак у Прыбалтыцы і Заходняй Еўропе вярнуўся ў сваю альма-матар, дзе ў 1860—1865 гг. выкладаў паляводства, лугаводства, а таксама палітычную эканомію. Пасля быў пераведзены ў Пятроўскую земляробчую і лясную акадэмію (Масква), зрабіў выдатную кар'еру вучонага і арганізатара. Сёння Сельскагаспадарчы каледж «Багародзіцкі» імя І. А. Сцебута, заснаваны ў 1898 г., лічыцца найстарэйшай адукацыйнай установай агранамічнага профілю не толькі Тульскай вобласці, але і ўсёй Расіі.

У пачатку XX ст. у Багародзіцку рыхтаваліся аграномы шырокага профілю. Першы выпуск адбыўся ў 1904 г. Навучанне было шасцігадовым, яго кошт складаў 200 руб. у год — вялікія па тым часе грошы. У распараджэнні выкладчыкаў і навучэнцаў мелася багатая гаспадарка: ворыўная зямля, сад, агарод, гадавальнік пладовых і паркавых дрэў, птушка- і жывёлагадоўчыя фермы, пасека. Дзякуючы сістэме сажалак, рыбнаму заводу свежай прадукцыяй забяспечвалася амаль уся Тульская губерня. Кожны вучань меў сваю дзялянку, індывідуальную тэму даследаў.

З фондаў Літаратурнага музея М. Багдановіча.

Уладзімір Жылка (злева) з сябрам. Багародзіцк, 1917 г.

Гонарам вучылішча быў шыкоўны кветнік. Калі ў гісторыі адукацыйнай установы натрапляеш на інфармацыю пра яго, некаторыя біяграфічныя звесткі пра У. Жылку паўстаюць у іншым святле. Так, у лісце да У. Калесніка ад 16 красавіка 1969 г. Б. Жылка адказваў на пытанне пра вытокі эстэтычнага густу свайго брата-паэта наступнае: «Наконт кветак, то ў нас у сям'і іх любілі, любіла й маці, гэта прывілося і нам. У нас усюды перад хатаю былі кветкі. Нават людзі смяяліся, што хлопцы лепш за дзяўчат кветкі росцяць. У хаце, як пачнецца вясна, пачынаючы з падснежніка, увесь час да марозу ў нас стаялі букеты. <…> А калі хто ідзе з нас з поля ці з лесу, ці з сенажаці, ці з рэчкі, то ўсё роўна прынясе кветак у хату».

«Земледелка» (так папросту называлі вучылішча ў пачатку XX ст. і пазнейшыя часы) славілася сваёй дысцыплінай, як казалі, казарменным рэжымам. Пры гэтым свабода была ў творчым самавыяўленні. Не толькі аб працоўным, але і аб эстэтычным выхаванні навучэнцаў дбалі ў Багародзіцку. Да паслуг ахвотных і здольных, усіх зацікаўленых быў сімфанічны аркестр, драматычны гурток, у якім ставіліся п'есы Астроўскага, Гогаля, Чэхава, Ібсена, Гаўптмана і інш.

Пра своеасаблівы культ кнігі ў сям'і, увагу да рускай літаратурнай класікі пісаў і Барыс Жылка 6 сакавіка 1966 г.:

«Бацькі нашы адносіліся да кніжак з павагаю і ніколі не шкадавалі грошай на набыццё, то іх у нас і было многа па таму часу і па нашаму становішчу, бо выязжаючы ў Клецішча адна падвода цалкам была нагружана кніжкамі. Пушкін, Лермантаў, Надсан, Цютчаў, Майкаў, Фет, усе дадаткі да часопісаў: тут былі і ўсе кніжкі беларускія, якія толькі выйшлі да 1919 г.».

Лічыцца, што першыя беларускія вершы У. Жылка напісаў у 1918-м, а публікацыі твораў з'явіліся ў 1920 г. Але ў сувязі з вышэйадзначаным лагічна было б меркаваць, што творчая хваля не магла не захапіць паэта раней, яшчэ ў Багародзіцку. Магчыма, гэта былі допісы (зразумела, на рускай мове) у насценную газету, дэкламацыя для студэнцкай аўдыторыі, урэшце, публікацыі ў друку.

Тытульны бок паштоўкі, адпраўленай У. Жылкам з Багародзіцка ў Мінск.



З фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Адваротны бок паштоўкі, адпраўленай з Багародзіцка, з тэкстам У. Жылкі. 1916 (?) г.

У снежні 1917 г. Уладзімір Жылка ўжо ў Мінску. Дапамагае бацьку, акунаецца ў бурлівае грамадскае жыццё губернскага горада. Знаёміцца з беларускімі пісьменнікамі, сям'ю Жылкаў адведвае сам Янка Купала. Прыдалося і прафесійнае навучанне: у 1918—1919 гг. У. Жылка разам з М. Чаротам працуе аграномам у нацыяналізаваным маёнтку пад Мінскам. Думаецца, аб'ект нашай увагі вярнуўся з Багародзіцка на радзіму не толькі са сціплым студэнцкім пажыткам, але і з даволі важкім інтэлектуальным багажом, заўважаным і ацэненым творчай эліітай сталіцы Беларусі.

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук

Жыццё аддаў народу

Перапіска Саюза пісьменнікаў, яго кіраўнікоў з вышэйшай у рэспубліцы партыйнай інстанцыяй часам падводзіць да думкі, што, маўляў, кожны крок творчаму саюзу трэба было ўзгадняць.

Можа, яно і так… Але ж пісьменнікі спадзяваліся на ЦК і з іншага пункту гледжання: у структураванай адміністрацыйна-партыйнай сістэме не проста ўзгадняліся тыя ці іншыя пытанні, а з ліста, са звароту ў ЦК КПБ, са звароту непасрэдна да Пятра Міронавіча Машэрава альбо да сакратара ЦК Аляксандра Трыфанавіча Кузьміна пачыналася выпрацоўка механізму вырашэння таго ці іншага пытання. «Хітрасць» была ясная і зразумелая ўсім: дасць ЦК «добра» — і ў выніку падключацца органы ўлады на месцах, будзе задзейнічаны ўрад, адпаведныя міністэрствы безапеляцыйна пачнуць займацца тым ці іншым патрэбным клопатам. Відавочна, што ўгаварыць кожную з інстытуцый спрычыніцца да вартай і патрэбнай грамадству, айчыннай культуры, нацыянальнай літаратуры справы паасобку наўрад ці атрымалася б… Пункт гледжання ЦК, рашэнне ЦК, яго падказка — зусім іншая справа.

Вось і ў выпадку з ушанаваннем памяці народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Ніл Гілевіч звяртаецца ў ЦК… 4 студзеня 1981 Ніл Сымонавіч падпісвае ліст да сакратара ЦК КПБ А. Т. Кузьміна… «Паважаны Аляксандр Трыфанавіч!

8 лютага 1981 года спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, лаўрэата Ленінскай прэміі Івана Паўлавіча Мележа.

Сваё кароткае жыццё ён цалкам аддаў служэнню роднаму народу, Савецкай Радзіме, Камуністычнай партыі, пакінуўшы багатую і непаўторную спадчыну, узнавіўшы ў мастацкіх вобразах этапныя перыяды няўхільнага поступу Кастрычніцкай рэвалюцыі па краіне. Творы яго вядомы людзям яшчэ са школьных гадоў, яны шырока перакладзены на мовы народаў СССР і многія замежныя.

Фота БелТА.

Іван Мележ.

Юбілейную дату Івана Мележа варта было б адзначыць шырока ў друку, па радыё і тэлебачанні, у школах, бібліятэках, палацах культуры і клубах, на радзіме пісьменніка і ў Мінску, дзе ён вучыўся і працаваў да апошніх дзён свайго жыцця.

У Мінску агульнагарадскі вечар, на наш погляд, варта было б правесці ў тэатры імя Янкі Купалы, на сцэне якога ішлі яго п'есы ("Пакуль мы маладыя" і "Дні нашага нараджэння"), а таксама інсцэніроўка па раману "Людзі на балоце". Гэты спектакль мог бы стаць мастацкай часткай вечара».

Канкрэтная праграма… Праўда, ліст напісаны, што называецца, у самы-самы пярэдадзень юбілею… Чаму не звярнуліся раней? Мо баяліся, што навагоднія святы зблытаюць усе папярэднія планы? Мо разлічвалі, што нагадаць пра юбілей за месяц — час дастатковы?.. Хто ведае "кухню" праходжання афіцыйных папер у высокіх інстанцыях, задумаецца: а ці не сапраўды запозна звярнуліся… Адным словам, можна толькі такое апраўданне знайсці: маўляў, усё і без таго адладжана і будзе рухацца, адзінае, што трэба — "добрая воля" ЦК партыі… Альбо — і ў самім Саюзе паставіліся да будучага юбілею фармальна, пра важкасць святкавання гаворку вялі на словах, не дужа рупячыся пра саму высокую падзею, якая змагла б прыцягнуць найбольшую ўвагу да класіка беларускай літаратуры, які "жыццё аддаў служэнню роднаму народу"»…

Што ж вырашылі ў ЦК КПБ?.. Пытанне даручылі разгледзець двум аддзелам — культуры і прапаганды і агітацыі. На той час іх узначальвалі Іван Іванавіч Антановіч і Савелій Яфімавіч Паўлаў адпаведна. 23 студзеня яны падпісваюць службовую запіску… Чытаем, што ж было вырашана ўсяго за два тыдні да самога юбілею: «8 лютага 1981 г. спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння лаўрэата Ленінскай прэміі народнага пісьменніка Беларусі Івана Паўлавіча Мележа.

Саюз пісьменнікаў БССР увайшоў у ЦК КПБ з прапановай па правядзенні юбілею І. П. Мележа. Аддзелы культуры, прапаганды і агітацыі ЦК КПБ вывучылі дадзенае пытанне і лічаць мэтазгодным:

1. Стварыць камісію па падрыхтоўцы і правядзенні юбілею І. П. Мележа ў наступным складзе: Гілевіч Н. С. (старшыня камісіі), Нерад Н. С., Ульяновіч А. І., Быкаў В. У., Адамовіч А. М., Бураўкін Г. М., Дзялец М. І., Чыгрынаў І. Г., Яроменка М. М., Тоўсцік А. А., Сярноў Р. І.

2. Даручыць Мінскаму гаркаму КПБ сумесна з Саюзам пісьменнікаў БССР і Міністэрствам культуры БССР правесці агульнагарадскі ўрачысты юбілейны вечар І. П. Мележа 11 лютага 1981 г. у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. (Затраты па афармленні памяшкання тэатра і арганізацыі мастацкай часткі вечара (спектакль "Людзі на балоце") нясе Саюз пісьменнікаў БССР.)

3. Міністэрству культуры БССР, Міністэрству асветы БССР забяспечыць арганізацыю вечарын, кніжных выставак, прысвечаных 60-годдзю з дня нараджэння І. П. Мележа, у культустановах і школах рэспублікі.

4. Хойніцкаму РК КПБ сумесна з Саюзам пісьменнікаў БССР правесці юбілейныя мерапрыемствы на радзіме пісьменніка.

5. БелТА, рэдакцыям рэспубліканскіх газет, Дзяржаўнаму камітэту БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанню забяспечыць асвятленне юбілею І. П. Мележа ў перыядычным друку, па тэлебачанню і радыё…»

Праграма, несумненна, цэласная і правільная… Кантроль наладжаны. Захавалася і такая запіска: «11 лютага 1981 г. адбудзецца юбілейны вечар, прысвечаны 60-годдзю з дня нараджэння І. Мележа. Просім прадоўжыць тэрмін выканання дакумента <…> да 12 лютага г. г.». Падпісаў запіску загадчык аддзела культуры ЦК КП Беларусі І. Антановіч. Унізе — 5 лютага — рэзалюцыя: «Тэрмін прадоўжыць да 12 лютага 1981 г.». На запісцы, якой дакладвалі сітуацыю, два загадчыкі — І. Антановіч і С. Паўлаў — рэзалюцыя па факце (падпісаў яе А. І. Бутэвіч): «Усе пункты выкананы ў поўным аб'ёме. Праведзены мерапрыемствы на радзіме І. П. Мележа, у школах, ВНУ. 11 лютага 1981 г. адбыўся агульнагарадскі вечар, прысвечаны 60-годдзю І. П. Мележа…»

З 1981 года мінула нямала часу. У 2021-м адзначалі ўжо 100 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Аўтара неўміручых раманаў пра беларускую вёску згадвалі і ў друку, і на тэлебачанні і радыё. Самымі ўдзячнымі ў дачыненні да памяці пра Івана Мележа былі, канешне ж, землякі — жыхары Гомеля, Хойнік і Хойніцкага раёна. Варта згадаць, што ў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэцы імя У. І. Леніна працуе ўнікальны па сваёй цеплыні, па насычанасці мемарыяльнымі рэчамі літаратурна-краязнаўчы музей, прысвечаны пісьменнікам Гомельшчыны. І ўвага ў яго экспазіцыі да Івана Мележа самая што ні ёсць шырокая…

Напамін пра старыя архіўныя «паперы» — гэта яшчэ і падказка нам, сённяшнім: «Не забыць!..» Беларускае прыгожае пісьменства настолькі багатае і вартае ўвагі, што, мінаючы пэўныя вялікія даты стваральнікаў нацыянальнай літаратуры, мы ў выніку страчваем нешта важнае і сёння…

Кастусь ЛЕШНІЦА

Слаўся, жанчына!

Дзе толькі ні пабываў народны паэт Беларусі Максім Танк! І адкуль бы ні вяртаўся, не толькі з новымі ўражаннямі, а вершамі. Адны з іх пісаліся ў час падарожжаў, іншыя — па вяртанні дамоў. Некаторыя, будзем праўдзівымі, носяць у сабе і адзнаку часу, калі пісаліся. Але ёсць у Яўгена Іванавіча твор, які, як ні адзін з тых, што створаны далёка ад Радзімы, выклікае асаблівае ўражанне. Не здагадваецеся які? А калі добра падумаць… Канечне ж, «*Ave Maria*»! Многія яго і на памяць ведаюць:

Звон кафедральны кліча на Ave.
З цесных завулкаў злева і справа
Гуртам манашкі ў чорным адзенні
Цягнуцца, быццам сумныя цені.
Тут і старыя, і маладыя, —
Ave Maria…

Усяго сем строф. Але якіх! Напоўненых тым, што ў перакладзе на беларускую мову азначаюць «Жыві, слаўся, Марыя». Калі глядзець шырэй, то яны ўвасабляюць у сабе больш значны змест: «Жыві, слаўся, жанчына». Цудоўны верш! Адзін з найлепшых знаўцаў сучаснай беларускай паэзіі, не кажучы пра тое, што і сам выдатны паэт, Алег Лойка слушна сказаў: «Увесь верш — гэта, па сутнасці, малітва паэта на характаво дзяўчыны. Але не малітва, на якую траціць свае дні і ночы манашка. Гэта малітва ў імя яе разняволення, слова ў бітве за маладосць, за будучыню».

Твор гэты прыгадаўся мне невыпадкова. Пераглядаючы ў адной са сваіх кніжных шаф мініяцюрныя кнігі, я з найвялікшым задавальненнем адшукаў і гэты томік, што так і называецца — «*Ave Maria*». Некалі сам Максім Танк паклапаціўся, каб тыя чытачы, якія захочуць пазнаёміцца з яго любоўнай лірыкай, не шукалі гэтыя творы ў ранейшых зборніках, а знайшлі пад адной вокладкай. Агаворка «некалі» таксама невыпадковая.

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» кніжка выйшла ў 1980 годзе, але, калі пацікавіцца зыходнымі данымі, шлях яе быў няпростым. Работнікамі выдавецтва яна была здадзена ў набор 3 ліпеня 1976 года, а падпісана ў друк толькі 13 снежня 1979 года. Нямала давялося парупіцца, каб гэты своеасаблівы «Збор твораў» з'явіўся. Канешне ж, нямала пастараўся мастак Міхаіл Басалыга, а таксама рэдактар Алесь Бачыла, мастацкі рэдактар Леанід Прагін… Хапіла клопатаў і работнікам тагачаснага Паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа, прозвішчы некаторых з іх названы.

Кніжка мініяцюрная, але, паколькі набрана дробным шрыфтам, атрымалася аб'ёмнай — 3,46 улікова-выдавецкіх аркушаў. Дарэчы, наклад яе такі, што застаецца толькі пазайздросціць: 5 тысяч асобнікаў. А ў пачатку невялічкае слова Яўгена Іванавіча, чым кіраваўся ён, выбіраючы гэтыя, а не іншыя творы: «Героямі гэтай кнігі з'яўляюцца двое: Яна і Ён. А зместам — каханне. Аўтар выбраў са сваіх твораў толькі тое, што найбольш поўна раскрывае гэтае высокае пачуццё». Таму вершаў і атрымалася так шмат, але, безумоўна, асноўны «*Ave Maria*».

Кожная страфа яго заканчваецца рэфрэнам. Але калі ў першай пасля слоў «*Ave Maria*» стаіць шматкроп'е, то ў наступных яго замяняе клічнік. Гэта Алег Лойка вытлумачвае так: «<…> у першай страфе ён пакуль не спатрэбіўся. <…> Але вось паэт звярнуў увагу на сямнаццацігадовую манашку, і радок нібы захвалявала: ён густа пачаў перабівацца коскамі, інтанацыйна рвацца»:

Я не звярнуў бы і ўвагі, можа,
Каб не пабачыў між іх прыгожай
Стройнай манашкі, якая мае
Не больш, хіба, як сямнаццаць маяў;
Чорныя вочы, бровы густыя, —
Ave Maria!

Глядзіць набожна на крыж пятровы,
А я малюся на яе бровы:
Няўжо, красуня, не шкадуеш,
Што хараство і жыццё марнуеш?
Як танцавалі б ножкі такія, —
Ave Maria!

Ды гэта не можа адбыцца: «Не знаю, можа, мая малітва // Выйграць бы мне памагла гэту бітву, // Але пазвалі яе; манашка // Пайшла за ўсімі, ўздыхнуўшы цяжка, // Пад зводы змрочныя і глухія, — Ave Maria!..»

Праўда, гадоў колькі назад, не памятаю дзе, давялося прачытаць завочны папрок Яўгену Іванавічу. Зводзіўся ён да наступнага: як можна захапляцца гэтым творам, калі, маўляў, шаноўны паэт ледзь не адмаўляў чалавеку самому вырашаць свой лёс. Хоць чаму асабліва здзіўляцца? Якія сёння «вершы» пішуцца, такія і прэтэнзіі да сапраўднай паэзіі.

Язэп ЛІТВІНОВІЧ

Учора і сёння

Выставачны праект Беларускага саюза мастакоў «Скульптура — гораду» працуе ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва». Ініцыятыва прысвечана скульптуры сталіцы: расказваецца пра тое, якой яна была ў мінулыя дзесяцігоддзі і якой паўстае перад намі сёння. Бясспрэчна, скульптура вызначае культуру горада і, па меркаванні знаўцаў, надае форму помнікаў і манументаў яго «культурным слаям».

Леў Гумілеўскі «Уладзімір Караткевіч» (праект помніка), 2015 г.

«Скульптура — гораду» прадстаўляе творы, якія з'явіліся на вуліцах і плошчах сталіцы ў апошнія дзесяцігоддзі. У іх ліку — помнікі і мемарыялы, прысвечаныя жыхарам горада і знакавым асобам краіны, яе галоўным падзеям. Многія з вызначальных для Мінска кампазіцый прадстаўлены на планшэтах і ў мадэлях. Між тым праект створаны на аснове матэрыялу, які ўжо прадстаўляўся публіцы. Вялікая частка экспазіцыі — творы, якія зараз праектуюцца і прапануюцца аўтарамі для экспанавання ў той ці іншай грамадскай прасторы. Галоўным для стваральнікаў праекта было падкрэсліць, што беларуская скульптура змяняецца разам з часам, прапаноўваючы сучаснаму гораду свае варыянты мастацкага напаўнення яго прасторы.

На выстаўцы дэманструюцца работы як вядомых айчынных скульптараў, так і маладых аўтараў. Іх тэматычныя, ідэйныя, стылістычныя зацікаўленні даволі розныя, таму вельмі цікава назіраць, як той ці іншы аб'ект упісаны ці будзе ўпісаны ў канкрэтную звыклую мясцовасць. Шмат у чым дапамагаюць у падарожжы па скульптурным асяроддзі Мінска карты — «Мінск скульптурны — учора» і «Мінск скульптурны — сёння»: дзякуючы ім магчыма зрабіць высновы аб тым, які раён Мінска па зразумелых ці не зусім прычынах абдзелены ўвагай, а які стракаціць творамі мастацтва, якія тэмы пераважалі ў творчасці скульптараў мінулага веку і да якіх яны звяртаюцца апошнім часам, якія перспектывы ў горада…

Цікавым падаецца мяжа ад «учора» да «сёння», праведзеная стваральнікамі праекта. Так, калі звяртацца да храналогіі, то найбольш познія творы мінулага перыяду — ландшафтна-паркавыя скульптуры па выніках пленэраў у Парку імя Янкі Купалы: кампазіцыі Уладзіміра Слабодчыкава, Аляксандра Фінскага, Эдуарда Астаф'ева і іншых творцаў датуюцца перыядам ад 1988 да 1989 года. Да гэтага часу ў Мінску ўжо красаваліся фантан «Юнацтва» (1972; скульптар Анатоль Анікечык, архітэктар Сяргей Мусінскі), барэльеф «Салідарнасць» (1979; скульпт. Анатоль Арцімовіч, арх. Васіль Герашчанка), помнік Максіму Горкаму (1981; скульпт. Андрэй Заспіцкі, Іван Міско, Мікалай Рыжанкоў, арх. Алег Трафімчук)… Вынікае, што далёка не ўмоўная, а цалкам канкрэтная мяжа паміж перыядамі была абсалютна відавочнай — распад Савецкага Саюза (непрынцыпова, але хацелася б, каб размежаванне будавалася па іншых крытэрыях). «Мінск скульптурны — сёння» — гэта помнік Язэпу Драздовічу (1993; скульпт. Ігар Голубеў, арх. Вячаслаў Марухін), кампазіцыя, прысвечаная Міколу Гусоўскаму (1999; Уладзімір Панцялееў), памятны знак «Мінск-4» (2014; скульпт. Яўген Колчаў), і скульптура «Беларусам — героям космасу» (2018; скульпт. Іван Міско, арх. Валерый Мітрафанаў)…

Валерыя Бірала «Дотык», 2018 г.

Аляксандр Фінскі «Саламон Міхоэлс — кароль Лір» (мемарыяльны знак), 2016 г.

Кірыл Крохалеў «Гарызантальны матыў», 2021 г.

Убачыць выявы мноства скульптурных аб'ектаў Мінска, палічыць і штосьці параўнаць на картах — займальная справа, якую можна скарыстаць і ў адукацыйных мэтах (хоць тут ёсць неабходнасць папракнуць арганізатараў выстаўкі за пэўныя недарэчнасці і недакладнасці ў падачы інфармацыі). Між тым не меней цікава разважаць пра перспектывы ў гэтай сферы — праекты айчынных скульптараў дазваляюць гэта зрабіць. Сучасным майстрам цікавыя стылістычныя эксперыменты, выкарыстанне і сумяшчэнне розных матэрыялаў, пошук новых тэхнік і зварот да колеру. Апошні крок пакуль яшчэ не вельмі ўпэўнены, відаць, што хапае сумненняў у яго неабходнасці, аднак асцярожна мастакі дадаюць фарбаў у такі сціплы і часта шэры Мінск. Так ці інакш, горад мае патрэбу ў спробах маладых мастакоў. Нават мінулае падказвае: некаторыя помнікі, якія так палюбіліся мінчанам, стваралiся ў свой час як дыпломныя работы.

У ліку прапаноў сталых і пачынаючых творцаў — абстрактныя арт-аб'екты і жанравыя работы, прысвечаныя культуры краіны. Меней сацыяльнага, болей аўтарскага. Унутраныя і знешнія абмежаванні нарэшце губляюць сваю моц. Хоць, натуральна, ад той жа традыцыі ў скульптуры ніхто не збіраецца адмаўляцца — сталіца, нягледзячы на пэўнае пашырэнне, абнаўленне новымі кварталамі, усё ж неахвотна змяняе сваё аблічча. Так, мастакі і скульптары, відавочна, баяцца нашкодзіць прасторы. У той жа час запэўніць горад у важнасці і неабходнасці той ці іншай скульптуры надзвычай цяжка (хоць і, магчыма, вынікі работы над новымі станцыямі метрапалітэна сцвярджаюць паспяховасць сучаснай скульптуры і яе бачання творцамі). Тут і фармат конкурсаў не заўсёды бывае ўдалы. Таму аўтары чакаюць водгукаў — найперш ад гледачоў. Выстаўка «Скульптура — гораду» працягнецца да 19 сакавіка.

Антон Шыпіца «Зюзя» (з серыі «Беларуская міфалогія»), 2017 г.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Заклік да дыялогу

Скульптурнаму абліччу Мінска была прасвечана прэс-канферэнцыя, што нядаўна прайшла ў Доме прэсы. Сярод спікераў — Наталля Шаранговіч, першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў, Іван Арцімовіч, старшыня секцыі скульптуры, і Вадзім Дражын, першы намеснік старшыні Беларускага саюза архітэктараў, начальнік упраўлення праектных работ закрытага акцыянернага таварыства «Белзамежстрой». У якасці экспертаў выступілі таксама члены секцыі скульптуры БСМ.

Мэта прэс-канферэнцыі «Скульптурнае аблічча Мінска: учора, сёння, заўтра» — расказаць, у першую чаргу, пра неабходнасць новага выставачнага праекта «Скульптура — гораду», мэта якога — дыялог.

— Скульптура, якая выходзіць у архітэктурнае, прыроднае асяроддзе, — паказчык узроўню культуры грамадства. Нашы праекты пастаянна вяртаюцца да пытання аб дыялогу мастака, улады, горада, архітэктара. Мы заклікаем да размовы, — адзначыў Іван Арцімовіч. — Не хацелася б, каб вуліцы беларускіх гарадоў, у тым ліку сталіцы, былі выпусташанай прасторай. Мінск — вялікі горад, Левіяфан, які можа паглынуць практычна любы скульптурны аб'ём, таму нам вельмі важна паспяваць за гэтым развіццём, за пашырэннем горада, каб нашы аб'екты, нашы прапановы своечасова траплялі ў асяроддзе і стваралі культурны код, напаўнялі прастору пэўным зместам.

У сваю чаргу першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч падкрэсліла, што за перыяд правядзення выстаўкі Беларускі саюз мастакоў мяркуе ініцыяваць, напрыклад, круглы стол, запрасіўшы туды не толькі мастакоў, якім ёсць што паказаць і прапанаваць, але і прадстаўнікоў улады, тых, хто б мог ацаніць усё прадстаўленае, для каго гэта было б цікава ў будучыні.

Пра неабходнасць маштабных фестываляў разважаў Вадзім Дражын. Так, сёлета адбудзецца Нацыянальны фестываль архітэктуры «Мінск-2023», які збярэ архітэктараў і скульптараў з усёй краіны. Абяцаюць прадэманстраваць мноства кірункаў арганізацыі асяроддзя. Традыцыйна фэст будзе прымеркаваны да Сусветнага дня архітэктуры, які адзначаецца ў першы панядзелак кастрычніка. У ліку патрэбных ініцыятыў — скульптурны пленэр у Мінску (апошні адбыўся ажно ў 2006 годзе). Ужо тры гады Беларускі саюз мастакоў вядзе на гэту тэму актыўны дыялог з гарадскімі ўладамі. Як сцвярджаюць мастакі, вынікам праекта мог бы стаць парк скульптур.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Фатаграфія — адна з найважнейшых вынаходак у гісторыі чалавецтва, уплыў якой не толькі на развіццё прыродазнаўчай навукі, але і на культуру, мастацтва, свядомасць насельніцтва зямнога шара немагчыма пераацаніць. Дзякуючы фатаграфіі людзі навучыліся максімальна дакладна, амаль што ў нязменным выглядзе, захоўваць знешнія рысы аб'ектаў, якія іх акаляюць. Натуральна, апошняе стала магутным штуршком і да развіцця гістарычнай навукі: для нашчадкаў фатаграфічныя сведчанні з'яўляюцца найкаштоўнейшай крыніцай па вывучэнні спадчыны… Пра гэта і не толькі разважалі ўдзельнікі і госці ўрачыстага адкрыцця выставачнага праекта «Ад негатыва да пазітыва» ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі.

Фота Віктара Іванчыкава.

Падчас адкрыцця.

Люстэркі з памяццю

Найвялікшае мастацтва

Падзея была прымеркавана да запуску ў музейнай установе сектара фатаграфічных даследаванняў. З'яўленню такога аддзела садзейнічала пагадненне паміж Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь і Музейна-выставачным цэнтрам «Росфото» з Санкт-Пецярбурга, падпісанае пры пасрэдніцтве міністэрстваў культуры Беларусі і Расіі на V Музейным форуме ў пачатку снежня 2022 года. «Распачаўшы работу па алічбоўцы музейных прадметаў, мы зразумелі: фатаграфіяй трэба займацца глыбока. Узаемадзеянне з "Росфото" важна для нас. Гэта буйны навукова-даследчыцкі цэнтр, які напрацаваў вялізную метадычную базу па вывучэнні і даследаванні фатаграфій. <…> Спецыялісты цэнтра гатовы падзяліцца з нашым калектывам сваімі напрацоўкамі, арганізоўваючы штогадовыя стажыроўкі», — адкрыў мерапрыемства дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр Храмы.

Узначаліла сектар фатаграфічных даследаванняў Святлана Харужык, загадчыца інфармацыйна-выставачнага аддзела музея і куратарка праекта «Ад негатыва да пазітыва»: «Першыя фота былі па-сапраўднаму дарагімі і ў прамым і ў пераносным сэнсах! А сёння яны ўвогуле бясцэнныя. Для любога музея вялікі гонар — мець іх у сваіх фондах». Аляксандр Храмы дапоўніў гэтую думку: «Ва ўсім свеце ўжо пачынаюць вывучаць разнастайныя першыя тэхнікі фатаграфавання, укладаюць каталогі з работамі першых фатографаў. У Беларусі пакуль пытанне не вывучаецца так глыбока. Але дзякуючы падтрымцы Мінкульта ў нас цяпер ёсць спецыяльная секцыя. У нашых архівах — каля 50 тысяч прадметаў, звязаных з гісторыяй фатаграфіі». Унёс сваю лепту і Уладзімір Ліхадзедаў, гісторык, філакартыст, аўтар праекта «У пошуках страчанага», лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Падчас свайго выступлення Уладзімір Аляксеевіч, чыя калекцыя паштовак і старых фатаграфій стала асновай новай экспазіцыі, распавёў падрабязней пра некаторыя з экспанатаў, паказаў на слабыя месцы навукі аб фатаграфіі на сучасным этапе, а таксама на перспектывы яе развіцця. Выступоўца, у прыватнасці, звярнуў увагу на недастатковую даследаванасць адваротнага боку рарытэтных здымкаў: тыльная частка нярэдка хавае інфармацыю не толькі аб месцы і часе, калі была зроблена фотакартка, але і звесткі асабістага характару — інскрыпты альбо цэлыя пасланні. Падтрымаў даследчыка Алесь Карлюкевіч, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», які прысутнічаў на мерапрыемстве. «Для тых, хто працуе з медыйнымі рэсурсамі, вельмі важна, што ў краіне ёсць спецыялісты, якія апісваюць гістарычныя здымкі, захоўваюць іх і сістэматызуюць», — зрабіў акцэнт ён.

Амбратыпы сямейства Капланаў, 1854 — 1860-я гг.

Сугучных меркаванняў прытрымліваецца і пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Барыс Грызлоў. Дыпламат таксама наведаў выстаўку: «Лічу, што фатаграфія — гэта не толькі найвялікшае адкрыццё ў гісторыі чалавецтва, але і найвялікшае мастацтва». Не забыў Барыс Вячаслававіч і аб нядаўнім узнагароджанні Уладзіміра Ліхадзедава ордэнам Дружбы Расійскай Федэрацыі за заслугі ва ўмацаванні дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі: «Не лішнім будзе чарговы раз нагадаць аб тым, як важна падтрымліваць гэтакімі высокімі ўзнагародамі тых людзей, якія ўсе свае сілы, веды, час і ўменні кладуць на важную даследчыцкую справу, што ідзе на карысць гісторыі».

Паляванне на святло

Згодна з рашэннем IX Міжнароднага кангрэса навуковай і прыкладной фатаграфіі (1935), годам нараджэння святлапісу прынята лічыць 1839-ы, калі Французскай акадэміі навук быў прадстаўлены даклад аб дагератыпіі (назва фізіка-хімічнага працэсу). Аўтарам патэнта называецца Луі Жак Мандэ Дагер, французскі вынаходнік, чые вопыты з ёдзістым срэбрам і ртуццю і прывялі да стварэння новай тэхналогіі. Разам з тым не варта скідваць з рахунку іншых паважных джэнтльменаў, якія ў той жа час ці нават яшчэ раней эксперыментавалі з тэхнікамі пісання святлом, шукаючы найбольш аптымальную з іх. Так, першая фатаграфічная выява — «Від з акна ў Ле Гра» — датуецца 1826 годам і належыць генію блізкага саратніка Луі Дагера — Жазефа Нісефора Ньепса.

Амаль два дзесяцігоддзі пасля свайго з'яўлення на свет дагератыпія не ведала хоць колькі-небудзь значных канкурэнтаў, нягледзячы на тое, што працэс стварэння дагератыпаў, між іншым, складаны і дарагі. Нярэдка пад адпаведныя фотаатэлье нават будавалі адмысловыя празрыстыя студыі са шклянымі сценамі і столлю. Кліентаў адпаведным чынам апраналі і наносілі ім на скуру спецыяльныя крэмы, а потым прымушалі нерухома сядзець у адной позе пад сонцам па трыццаць хвілін (а то і болей)…

Ды ўжо ў 1850-х гадах пачалі з'яўляцца амбратыпы (светлавыя малюнкі на шкле) і фератыпы (светлавыя малюнкі на метале). Тады фота асвоілі і на Беларусі. Першыя знойдзеныя тут здымкі на сёння маладаследаваны і ўяўляюць гістарычную каштоўнасць. З'явіўшыся ў сярэдзіне 1850-х, ужо напрыканцы дзесяцігоддзя, дзякуючы вышэйшым святлоадчувальнасці і якасці рэзультату, амбратыпія і фератыпія цалкам выцеснілі папярэднія рашэнні. Амбратыпы ўяўлялі сабой негатыўныя выявы на шкле, што пры размяшчэнні на чорным фоне (у ход ішла папера альбо чорная фарба, якой пакрывалі задні бок шкляной пласцінкі) даюць пазітыў. У сваю чаргу фератыпія прапаноўвала, так бы мовіць, маментальныя пазітывы на цёмнай лакіраванай і пакрытай калодыем металічнай пласціне.

Позірк праз стагоддзі

На выстаўцы «Ад негатыва да пазітыва» ў Нацыянальным гістарычным музеі гэтымі днямі можна ўбачыць арыгінальныя беларускія дагератыпы, амбратыпы і фератыпы без малога двухсотгадовай даўнасці. На суд гледачоў таксама выстаўлены здымкі, атрыманыя пры дапамозе іншых тэхналогій, першыя фотаапараты і рэдкія друкаваныя фатаграфічныя выданні канца XIX — пачатку XX ст., пазычаныя з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. Ладную частку экспазіцыі займаюць паштоўкі з беларускіх гарадоў, якія збірае даследчык.

Гледзячы на прадстаўленыя дагератыпы 1840-х — 1850-х гадоў з пэўнага ракурсу (такая ў іх асаблівасць: выява адкрываецца толькі таму, хто шукае), можна бліжэй пазнаёміцца са знатнымі асобамі краіны, захаванымі на сярэбраных і пасярэбраных пласцінах. Салідныя мужчыны ў фраках і разадзетыя дамы з моднымі ўкладкамі, як жывыя, пазіраюць на наведвальнікаў выстаўкі праз металічную тоўшчу, праз паціну стагоддзяў. Асобны стэнд прысвечаны сям'і вядомага прадпрымальніка, уладальніка тыпаграфіі Ільі Каплана. Дагератыпныя і амбратыпныя партрэты прадстаўнікоў славутага роду — толькі малая частка вялізнага архіва дакументаў і рэчаў, які Уладзіміру Ліхадзедаву пашчасціла набыць у нашчадкаў камерсанта. За вітрынай — здымкі са Швейцарыі, з Францыі, Англіі, Германіі, ЗША ды, само сабой, з розных куткоў Беларусі.

Дзякуючы архіву Капланаў, у наведвальнікаў выстаўкі ёсць магчымасць параўнаць дагератыпы з амбратыпамі. Апошнія захаваліся лепш, бо тэхналогія прадугледжвала абарону святлоадчувальнага слоя ад атмасфернага ўздзеяння, але патрэбны былі спецыяльныя рэактывы. Ды недахопу ў такіх не было: у Мінску ў бізнесмена, як назвалі б яго цяпер, меўся ўласны гандлёвы дом. Ён размяшчаўся на рагу Губернатарскай і Захар'еўскай вуліц (адпавядае перакрыжаванню вуліцы Леніна і праспекта Незалежнасці сёння). Тут працавала лаўка фотаапаратаў ад перадавых на той час вытворцаў і ўсяго неабходнага для фатаграфічнага рамяства. Аналагічнае абсталяванне канца XIX — пачатку XX стагоддзяў можна ўбачыць гэтымі днямі і ў Нацыянальным гістарычным музеі. Уласная фотакамера багатага сямейства суседнічае на стэндах са шматлікімі лістамі і паштоўкамі, дасланымі на мінскі адрас Капланаў з розных гарадоў.

Сувенірная паштоўка з відамі Полацка, пачатак XX ст.

Апроч усяго, выстаўка «Ад негатыва да пазітыва» прэзентуе наведвальнікам тэматычныя выданні мінулага, сярод якіх вылучаюцца некалькі нумароў «Фатаграфічнага лістка» за 1914 год і ілюстраваны каталог «Германскі экспарт». На адным з амбратыпаў 1850—1860-х гадоў, верагодна, выяўлены фатограф Антон Прушынскі, адзін з пачынальнікаў беларускай фатаграфіі. Твор не падпісаны, і з поўнай упэўненасцю сцвярджаць нельга, але чалавек на карцінцы вельмі падобны да Антона Прушынскага са здымка пазнейшага перыяду. Найбольш вядомая і, як мяркуюць даследчыкі, раняя фатаграфія майстра захоўваецца ў Варшаве — подпіс на адваротным баку паказвае на 1858 год. Аднак жа, на думку Уладзіміра Ліхадзедава, самы ранні здымак аўтарства Антона Прушынскага трэба шукаць не ў Польшчы, а ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея — ім з'яўляецца партрэт Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Бернард ЗАТЫЛКІН

Набатны кліч званоў

20 лютага 2023 г. у Вялікай зале Мінскага дзяржаўнага каледжа імя М. І. Глінкі адбылася творчая вечарына вядомага беларускага кампазітара, аўтара музычных твораў самай рознай жанравай скіраванасці, лаўрэата шматлікіх міжнародных конкурсаў Аліны Безенсон. Творы Аліны Безенсон трывала ўвайшлі ў рэпертуар навучэнцаў музычных школ, каледжаў, студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, салістаў і аркестраў. Яе музыка гучыць на канцэртных пляцоўках не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і ў шмат якіх краінах свету (Расія, Украіна, Балгарыя, Латвія, Літва, Польшча, Германія, Аўстрыя, Бельгія, Галандыя, Кітай, Мексіка, Туніс). Дарэчы будзе згадаць, што Аліна Іванаўна з'яўляецца выхаванкай выбітных майстроў мастацтва, у тым ліку і народнага артыста Рэспублікі Беларусь, прафесара Андрэя Юр'евіча Мдзівані, які вучыў яе кампазіцыі.

Творы Аліны Безенсон з'яўляюцца аб'ектам шматлікіх даследаванняў па музыказнаўстве ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. Кампазітар часта бярэ ўдзел у семінарах і лекцыях, мэта якіх — прапаганда беларускай музыкі, творчасці сучасных беларускіх кампазітараў. Аліна Безенсон з'яўляецца аўтарам перакладанняў для домры і цымбалаў каля 20 беларускіх кампазітараў, складальнікам зборнікаў «Беларуская Мазаіка для домры» (4 выпускі) і «Творы сучасных беларускіх кампазітараў для скрыпкі», іншых шматлікіх выданняў.

Вечарына распачалася з песні «Малітва» ў выкананні лаўрэата міжнародных конкурсаў Кацярыны Гагідзэ і сімфанічнага аркестра МДМК імя М. І. Глінкі (мастацкі кіраўнік і дырыжор Мікалай Макарэвіч). Гэты ж калектыў (салістка — лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў Дар'я Баханко) прадставіў канцэрт для цымбалаў з аркестрам «Кліч званоў». Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Залатая струна» гэтай жа навучальнай установы (мастацкі кіраўнік Ганна Полесава, канцэртмайстар Ірына Лук'янава) выканаў «Танга-нуэва».

Высокім майстэрствам вылучалася і выступленне ансамбля народных інструментаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (мастацкі кіраўнік — прафесар кафедры струнных народных шчыпкова-ўдарных інструментаў Леанід Іванавіч Чарняк, партыя фартэпіяна — кампазітар Аліна Безенсон). Прагучалі кампазіцыі «Спеў сэрца», «Таката», а таксама фантазія на тэму беларускай народнай песні «Сядзіць камар на дубочку».

Творы Аліны Безенсон звернуты да высокай духоўнасці, глыбокіх пачуццяў і перажыванняў. Музычная мова аўтара адрозніваецца натхнёнымі, выразнымі мелодыямі, своеасаблівымі маляўнічымі гармоніямі, мадуляцыямі, вылучаецца разнастайнасцю рытмічных малюнкаў, дынамічнасцю руху і развіцця. Гэта слухачы маглі ацаніць і ў прэм'ернай кампазіцыі «Званы Святыні» ў выкананні лаўрэата міжнародных конкурсаў аркестра беларускіх народных інструментаў Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа (мастацкі кіраўнік і дырыжор Сяргей Гладкі).

Гледачы маглі пераканацца і ў тым, што ў творчасці Аліны Безенсон вялікае значэнне маюць апрацоўкі і канцэртныя фантазіі на тэмы беларускіх народных песень для розных музычных інструментаў, ансамбляў і аркестраў народных інструментаў. Яны напісаны сучаснай арыгінальнай музычнай мовай з разнастайнымі поліфанічнымі, каларыстычнымі і санарыстычнымі прыёмамі, шумавымі эфектамі і характарызуюцца адмысловым падыходам да развіцця народных тэм. Спецыфіка ладу, інтанацыйная аснова, рытмічны малюнак і характар, закладзеныя ў аснову народных песень, беражліва захоўваюцца і развіваюцца кампазітарам у шмат якіх кампазіцыях. У музычнай фактуры шырока выкарыстоўваецца аркестравы гукапіс, выяўленчасць, кантраст паміж часткамі формы. Тонка паказаны тэхнічныя магчымасці, тэмбры, шырокі гукавы дыяпазон і штрыхавая разнастайнасць кожнага інструмента. Многія з адзначаных характарыстык знайшлі сваё праламленне ў канцэртнай кампазіцыі на тэму беларускай народнай песні «Кукавала зязюля».

Лаўрэат міжнародных конкурсаў Аркестр рускіх народных інструментаў Мінскага дзяржаўнага каледжа імя М. І. Глінкі.

Парадавала гасцей і выступленне лаўрэата міжнародных конкурсаў аркестра рускіх народных інструментаў (мастацкі кіраўнік і дырыжор Віталь Дубовік). Аліна Іванаўна выдала шмат сваіх музычных зборнікаў, сярод якіх — тры выпускі зборнікаў для аркестра рускіх народных інструментаў, яшчэ сем выпускаў падрыхтаваны і ў хуткім часе таксама пабачаць свет. Дзякуючы падобным выданням творы кампазітара актыўна выкарыстоўваюцца ў навучальных, конкурсных і канцэртных праграмах аркестравых калектываў дзіцячых музычных школ, музычных каледжаў, вышэйшых музычных навучальных устаноў, а таксама аматарскімі і прафесійнымі аркестрамі рускіх народных інструментаў.

Слухачы цёпла віталі і вядомую беларускую дамрыстку, дацэнта кафедры струнных народных шчыпкова-ўдарных інструментаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэата міжнародных конкурсаў Надзею Лазуцкую. У яе выкананні прагучала прэм'ера аркестравай версіі «Канцэрціна» для домры з аркестрам рускіх народных інструментаў.

З асаблівай замілаванасцю, цеплынёй і неверагоднымі эмоцыямі прысутныя сустрэлі выступленне вядомай беларускай спявачкі, лаўрэата Рэспубліканскіх конкурсаў эстрадных выканаўцаў Аліны Чыжык. У яе выкананні прагучала песня «Зямля мая» на словы вядомага беларускага паэта Валерыя Максімовіча. Гэтая кампазіцыя заняла асаблівае месца ў рэпертуары спявачкі. Песня ўжо гучала на розных музычных пляцоўках, з нагоды самых розных дзяржаўных свят і юбілеяў. Па прызнанні Аліны Чыжык, яна плануе праспяваць яе з Прэзідэнцкім аркестрам, зрабіць якасны студыйны запіс і надалей радаваць аматараў беларускай лірыка-патрыятычнай песні. У планах спявачкі — вынесці на суд слухачоў яшчэ адну песню на словы Валерыя Максімовіча «Жаўранкі» (музыка АліныБезенсон).

У фінале праграмы прагучала песня на словы Лізаветы Палеес «Ради мира».

Пасля музычнай праграмы выступілі шматлікія сябры, калегі, госці, якія сказалі шмат ухвальных слоў у адрас выдатнага майстра. Па прызнанні старшыні Саюза кампазітараў Беларусі Алены Атрашкевіч, Аліна Безенсон уносіць вялікі ўклад у справу развіцця беларускай музыкі сваімі харавымі, вакальнымі, камерна-інструментальнымі творамі. Яна падкрэсліла незвычайную працавітасць кампазітара, яе няўрымслівасць, актыўнасць, мэтанакіраванасць, рашучасць брацца за любую справу, за розныя жанры і стылі, яе схільнасць да наватарства, навізны, жаданне творча і рэзультатыўна супрацоўнічаць з рознымі калектывамі, салістамі, выканаўцамі. І сённяшняя імпрэза — таму пацвярджэнне.

Аб запатрабаванасці творчых адкрыццяў і знаходак сведчыць і тое, што творы Аліны Безенсон выконваюць сімфанічныя аркестры Белдзяржтэлерадыёкампаніі і Белдзяржфілармоніі, сімфанічны аркестр Гродзенскай капэлы (дырыжор — заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Борматаў), Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Аляксандр Анісімаў, дырыжор Юрый Караваеў).

Безумоўна, творчасць Аліны Безенсон істотна ўзбагачае музычную палітру беларускага мастацтва, надае ёй адметны шарм, гучанне, глыбокае і шматмернае змястоўнае напаўненне. Яна разлічана на розныя ўзроставыя катэгорыі слухачоў і выканаўцаў, розныя густы, можа задавальняць эстэтычныя прыхільнасці рознай аўдыторыі. Кожны знойдзе ў ёй сваё, адчуе асалоду ад судакранання з неймаверным спалучэннем гукаў, тонаў і паўтонаў, тэмбраў, іх пералівамі, пераходамі, перагукваннем. І дадзенае мерапрыемства з'яўляецца яшчэ адным красамоўным сведчаннем вялікага таленту мастачкі, яе жывой і святланоснай размовы з сабой, з людзьмі, з Сусветам.

Максім ТРАЯНОВІЧ
Фота даслана аўтарам

Настрой абнаўлення і лёгкасці

Вясна і музыка — найлепшыя лекі, каб прачнуцца ад зацяжнога сну і акрыяць. Па магчымасці завітвайце туды, дзе за цяжкімі і высокімі зачыненымі дзвярыма ў паўцемры прасторных залаў гучаць мелодыі, здольныя прынесці спакой, цеплыню і сілы.

Сёння камерны аркестр **Брэсцкай абласной філармоніі** і яго галоўны дырыжор Вячаслаў Прылепін запрашаюць на вялікі святочны канцэрт «Гісторыя кахання». Арганізатары падрыхтавалі праграму, у якую ўвайшлі меладычныя, пачуццёвыя саўндтрэкі з самых рамантычных фільмаў. Фрагменты адпаведных стужак будуць трансліравацца на вялікім экране. Асаблівым падарункам для гасцей філармоніі стануць хіты сусветнай эстрады. Канцэрт прымеркаваны да святкавання 8 Сакавіка.

5 сакавіка ў камернай зале **Вялікага тэатра Беларусі** запланаваны канцэрт «Флейты на канікулах». Для гасцей выступіць квартэт флейт тэатра: заслужаная артыстка Ларыса Ласоцкая, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Арцём Нямірскі, Арсен Замтарадзэ і Наталля Мурзіна. Суправаджаць выступленне будуць музыканты Міхаіл Канстанцінаў (ударныя) і Юлія Шчарбакова (фартэпіяна). Рэжысёрам выступае Наталля Кузьмянкова.

Мэта праграмы — перадаць слухачу настрой абнаўлення і лёгкасці, адчуванне пачатку вясны, доўгачаканага прыходу цяпла. Назву канцэрту даў твор кампазітара Жана Кастэрэда «Флейты на канікулах». Будуць гучаць таксама творы многіх кампазітараў, такіх як Шарль Гуно, Кэтрын МакМайкл, Сатошы Ягісава, Герман Біфцінк, Валерый Сапараў.

7 сакавіка ў **Беларускай дзяржаўнай філармоніі** (вялікая канцэртная зала) у суправаджэнні джаз-квартэта выступіць вакалістка і трамбаністка з Масквы Анастасія Іванова. У праграме — рамантычныя хіты Элы Фіцджэральд. Канцэрт прымеркаваны да Міжнароднага жаночага дня.

Анастасія Іванова — удзельніца прэстыжных джазавых конкурсаў і фестываляў у Маскве. Мультыінструменталістка зараз выступае на вялікай сцэне з легендай расійскага джаза Анатолем Кролам і джаз-аркестрам «Акадэмік-бэнд», Ігарам Бутманам і яго «Маскоўскім джазавым аркестрам», Канстанцінам Гевандзянам і яго дыксілендам «*Moscow Ragtime Band*», а таксама з Энтані Стронгам.

Тым часам у **Віцебскай абласной філармоніі** працягваецца цыкл лекцый-канцэртаў «*Ad libitum*». **9 сакавіка** ў малой зале будуць гучаць песні з рэпертуару Клаўдзіі Шульжэнкі, выдатнай савецкай эстраднай спявачкі, актрысы тэатра і кіно. Да таго ж ахвотныя пазнаёмяцца з біяграфіяй артысткі. Вядомы факт: з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны, добраахвотна ўступіўшы ў шэрагі дзеючай арміі, Клаўдзія Шульжэнка стала салісткай франтавога джаз-ансамбля. Больш за 500 канцэртаў далі артысты ў гады вайны, выступалі ў блакадным Ленінградзе, на лініі фронту… У канцы 1941 года ў рэпертуары спявачкі з'явілася песня «Синий платочек», якая стала адной з самых папулярных ваеннага часу.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Пошук родных літаратурных сімвалаў

У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага адбылася добрая, цёплая сустрэча. На круглы стол, дзе абмяркоўваліся з'явы, тэндэнцыі, звязаныя з сённяшнім станам мастацкай літаратуры, повязі яе якасцей, фарматаў з уплывам на чытача, для дыскусій і абмеркаванняў сабраліся кіраўнікі раённых цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм з усёй вобласці, пісьменнікі, якія працуюць на Берасцейшчыне. Давялося выступіць і мне.

Не збіраючыся рабіць справаздачу, якая, безумоўна, запатрабавала б дэталёвага пераказу дакладаў тых, хто выступаў на круглым стале, унікаючы дэталёвага аналізу даволі грунтоўных і шырокаабсяжных выступленняў як прадстаўнікоў калектыву, які ўзначальвае дырэктар абласной бібліятэкі Алена Стрыжэвіч, так і яе калег з рэгіёнаў — у прыватнасці, з Баранавіч і Ганцавіцкага раёна, а таксама старшыні Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяны Дземідовіч, падзялюся некаторымі суб'ектыўнымі развагамі.

Па-першае, бібліятэка — гэта мост паміж рэальнымі зацікаўленнямі чытача, які прыходзіць у яе сцены, і ўсімі тымі працэсамі, што адбываюцца ў кнігавыданні, у мастацкай літаратуры. І не толькі ў межах роднай Айчыны. Бібліятэкарам не проста задаволіць інтарэсы тых, хто адчыняе дзверы ў вялікія і малыя храмы кнігі. Для гэтага патрэбны як немалыя сродкі, так і шырокае веданне таго, што выдаецца, што друкуецца ў розных перыядычных выданнях. Сродкаў ніколі не бывае шмат, скажам так агульна, іх заўсёды не стае. Ведаў, у тым ліку крыніцазнаўчых, бібліяграфічных, ніколі не бывае мала. Якую ў такім разе выпрацаваць стратэгію набыцця кніг, якімі навінкамі перш-наперш напаўняць фонды — пытанне з пытанняў, адказ на якое трэба шукаць у няпростай штодзённай працы. Чалавек, які збіраецца наведаць бібліятэку, жыве па канкрэтным адрасе — у Брэсце, Ганцавічах, Баранавічах, Жабінцы, а то і ў невялікім паселішчы, дзе яшчэ працуе сельская бібліятэка, — і адпаведна яго там і трэба задаволіць у частцы чытацкіх зацікаўленняў.

Па-другое, і гэта было ўжо болей рэльефна акрэслена на круглым стале, — самі бібліятэкары ўважлівыя да роднага, блізкага, цесна звязаны з культурным, творчым жыццём у рэгіёне. Размова — пра паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, якія працуюць, жывуць у сваім краі, пра тых, хто нарадзіўся ў канкрэтнай мясцовасці. Гэтыя творчыя асобы, як правіла, самі цягнуцца да бібліятэк і разглядаюць іх як апірышча ў мастацкай, літаратурнай рабоце, як першую пляцоўку, дзе можна агучыць і выдадзеныя, і яшчэ не надрукаваныя творы. На Берасцейшчыне надзвычай уважлівыя да літаратурна-краязнаўчай працы. Гэта відаць і па тых бібліяграфічных намаганнях, што прыкладае абласная бібліятэка ў складанні базы ці банка даных у краязнаўчым фармаце, гэта відаць па мностве мерапрыемстваў, якія праводзяцца і ў самім Брэсце (з актыўнай руплівасцю Брэсцкай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы найперш), і ў раёнах Берасцейшчыны. Чытачы краю добра ведаюць імёны пісьменнікаў сваёй мясцовасці: у Ганцавічах — Васіля Праскурава, у Жабінцы — Васіля Сахарчука, у Пружанах — Міколы Антаноўскага, у Пінску, на Піншчыне — Валерыя Грышкаўца, Анатоля Шушко… Імёнаў, як кажуць, безліч…

Па-трэцяе, тут, у Брэсцкай вобласці, не забываюцца на папярэднікаў. Таму і юбілей Уладзіміра Калесніка адзначылі годна. Таму, відавочна, не забудуцца і пра сёлетні юбілей легендарнай Яўгеніі Янішчыц. Таму і традыцыя ў Баранавічах ёсць — праводзіць Таўлаеўскія чытанні, фактычна — навукова-практычны праект у гонар памяці паэта і падпольшчыка Валянціна Таўлая. І тут бібліятэкарам патрэбна падтрымка — такая праца не павінна застацца ўнутрыбібліятэчнай. Падтрымка і ад грамадскасці, і ад сістэмы адукацыі — як настаўнікаў, так і ўніверсітэцкіх выкладчыкаў, саміх устаноў адукацыі. Нешта апошнім часам не чуваць пра адкрыццё новых грамадскіх школьных літаратурна-краязнаўчых музеяў, пакояў літаратурна-краязнаўчага характару. А калі б работа па ўшанаванні пісьменнікаў-землякоў ішла супольна — і ў бібліятэках, і ў школах, то, паверце, гэта было б толькі на карысць. Патрэбна і падтрымка ад інстытутаў мясцовай улады. Напрыклад, у гонар Валянціна Таўлая, як вядома, названы вуліцы ў Баранавічах, Гродне, Лідзе, Слоніме, Маладзечне, Жыровічах Слонімскага раёна. Ёсць, на шчасце, вуліцы Уладзіміра Калесніка ў Брэсце, Міколы Засіма — у Пружанах і Брэсце… Ёсць вуліца Яўгеніі Янішчыц у Пінску, Міколы Калінковіча — у Лунінцы… Мо сёлета з'явіцца вуліца Яўгеніі Янішчыц і ў Брэсце? Не падказваючы ніякіх крокаў па мемарыялізацыі імёнаў пісьменнікаў-землякоў, проста заўважу, што варта было б імёны шмат каго з тых, хто нядаўна ці параўнальна нядаўна пайшоў з жыцця, увасобіць у назвах вуліц, бібліятэк, школ. Зрабіць гэта, канешне ж, можна толькі супольна, падрыхтаваўшы і грамадскую думку, і яшчэ раз вярнуўшыся да перачытання творчасці літаратараў.

Чацвёртае, што вынікае як урок, як заданне з круглага стала бібліятэкараў Брэсцкай вобласці. У рэгіёне ёсць уражальныя прыклады выкарыстання сучасных лічбавых, электронных сродкаў у справе папулярызацыі мастацкай літаратуры. Як прыклад — работа ганцавіцкіх бібліятэкараў. Пра гэта гаварыла на круглым стале Ала Хваль, дырэктар Ганцавіцкай раённай бібліятэкі імя Васіля Праскурава. Сучаснага чытача трэба пераконваць у вартасцях мастацкага слова, у вялікай яго ролі ў агульнакультурным, гуманістычным выхаванні чалавека, грамадства ўвогуле.

І пяты клопат… Толькі разам, з улікам запытаў бібліятэк варта фарміраваць планы ў дачыненні выдання кніг пісьменнікаў-землякоў. Тады і карысць будзе ад агульнай кнігавыдавецкай дзейнасці.

— Круглы стол, які мы правялі напрыканцы зімы альбо, скажам іначай, фактычна яшчэ на пачатку 2023 года, — зазначыла Алена Стрыжэвіч, — частка той сістэмнай працы, скіраванай на прапаганду айчыннай літаратуры, на падтрымку творчасці сучасных пісьменнікаў. І спадзяюся, што следам мы здолеем ажыццявіць і іншыя цікавыя, адметныя, скіраваныя на справу, на эфектыўнае вырашэнне розных праблем крокі.

А нам, кнігавыдаўцам, пісьменніцкай арганізацыі, застаецца толькі падтрымаць гэтыя памкненні…

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Айчынных фільмаў стане больш?

Дні беларускага кіно для свайго ж гледача і вытворчасць новых фільмаў: задачы па развіцці найважнейшага з усіх мастацтваў.

Хутка беларускае кіно будзе святкаваць юбілей — ёсць з чым, калі азірнуцца ў мінулае. Ёсць у айчыннага кіно свая біяграфія, было створана шмат, а тое, што не страціла сваёй чалавечай ці гістарычнай актуальнасці, можна паказваць у кінатэатрах, напрыклад, вылучыўшы асобны Дзень беларускага кіно. Па гэтым шляху пайшлі беларускія кінатэатры, павялічыўшы долю айчынных фільмаў у кінапракаце ў мінулым годзе. Школьнікі, моладзь альбо асобныя катэгорыі гледачоў могуць такім чынам наведваць кінапаказы дзеля асветы і выхавання, у тым ліку глядацкага. Айчынная кінакласіка, трэба думаць, будзе выклікаць гонар у публікі розных пакаленняў (быў такі час), і дазволіць зразумець нашу адметнасць у кіно з пункту гледжання тэм і тэндэнцый у асобных кірунках (іграды, дакументальны, анімацыйны). Вось толькі складана знайсці гледача, які не марыў бы пра сучасны беларускі вялікі (найперш іграды) фільм, які выклікаў бы не толькі жаданне пайсці ў кіно, але і сапраўдныя цікавасць і гонар. Гэтая мара застаецца ўпісанай і ў вынікі работы калегіі Міністэрства культуры Беларусі за мінулы год, на якой сярод гаворкі пра развіццё розных відаў мастацтваў асаблівую ўвагу надалі менавіта кіно.

Выніковыя лічбы быццам бы і някепскія: у 2022 годзе забяспечана вытворчасць 11 фільмаў. Адрэстаўрыраваны і алічбаваны 23 кінастужкі. Значна павялічана доля кінасеансаў з паказам фільмаў беларускай кінавытворчасці: 18 працэнтаў пры плане 6. Праведзена 12 дзён беларускага кіно за мяжой — у Таджыкістане, Узбекістане, Казахстане, Індыі, Расіі. Уведзена практыка правядзення Дзён беларускага кіно ва ўсіх рэгіёнах краіны. XXVIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» сабраў рэкордную колькасць заявак — 1360 ад удзельнікаў з 89 краін. Мерапрыемствы кінафестывалю адбыліся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Больш увагі заяўлена да маладых кінематаграфістаў: на кінастудыі «Беларусьфільм» у 2022 годзе створана студыя маладзёжнага кіно.

У той жа час па выніках працы за год рэспубліканскім прадпрыемствам Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» з даведзеных 14 паказчыкаў фінансава-эканамічнай дзейнасці выканана толькі 5. Не ўдалося дасягнуць выканання паказчыкаў па чыстым прыбытку. Рэнтабельнасць продажу мінусавая, атрыманы страты ад рэалізацыі прадукцыі. З мэтай выхаду на дзейнасць без страт у 2023 годзе неабходна забяспечыць эфектыўную сістэму кіравання прадпрыемствам і павышэнне ўзроўню адказнасці як кінастудыі, так і Міністэрства культуры, адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка.

Тут ёсць да чаго імкнуцца, бо калі ў краіне існуе кінастудыя (а гэта вялікае прадпрыемства, якое павінна вырабляць пэўную прадукцыю), то яна павінна працаваць напоўніцу. Без прастояў і страт. Адна з задач на бягучы год — забяспечыць максімальную загрузку вытворчых магутнасцей нашага галоўнага прадпрыемства, пры гэтым вытрымліваючы нарматыўныя тэрміны вытворчасці фільмаў. Што праўда, кінавытворчасць — спецыфічная галіна, да яе ўсё ж складана падыходзіць з выключна колькаснымі меркамі. Бо поспех кіно — найперш у якасці. А тут (незалежна ад таго, якое тэхнічнае абсталяванне і магчымасці маюцца на «Беларусьфільме») уключаецца «чалавечы фактар». Менавіта ад яго залежыць адмысловасць абраных тэм, адметнасць аўтарскага падыходу ці здольнасць зняць цікавы фільм для масавай аўдыторыі. Кінастудыі, паводле генеральнага дырэктара «Беларусьфільма» Уладзіміра Карачэўскага, сёння не хапае кваліфікаваных спецыялістаў розных кірункаў. Між іншым, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў яшчэ ў 2010 годзе быў створаны факультэт экранных мастацтваў. Менавіта таму, што ўзнікла патрэба ў спецыялістах у краіне з набыццём незалежнасці (за савецкім часам іх рыхтавалі па-за межамі рэспублікі, і на тых кадрах, якія прыехалі да нас па размеркаванні, у многім трымалася беларускае кіно). Але час ідзе, людзі сыходзяць ды і якасць спецыялістаў для сучаснага кіно цяпер патрабуецца крыху іншая. Факультэт павінен забяспечваць патрэбы Беларусі ў спецыфічных кадрах, але іх усё адно не хапае — з розных прычын. На гэта звярнулі ўвагу падчас калегіі, дзе прагучала заклапочанасць недастатковасцю кадраў, асабліва маладых. Але і выказваліся спадзяванні, што патрэбныя кадры для кінагаліны рэальна падрыхтаваць у Беларусі, толькі трэба, каб кантакты паміж кінастудыяй і акадэміяй былі больш актыўныя, а пры магчымасці падключаліся дзяржаўныя органы, якія маюць непасрэдны ўплыў на больш хуткае вырашэнне пытанняў, якія падкідвае жыццё.

— Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача па стварэнні кінапрадукцыі, запатрабаванай у гледача ў Беларусі і за мяжой. У беларускага кіно ёсць сур'ёзныя традыцыі. Але, на жаль, нашы трохгадовыя чаканні атрымаць яркія і запатрабаваныя гледачом праекты пакуль не спраўдзіліся. Відавочна, патрэбны фільм (і не адзін), які захочацца паглядзець некалькі разоў, які стаў бы сур'ёзнай інфанагодай і прыцягнуў бы ўвагу да айчыннага кіно, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Ларыса ЦІМОШЫК

Ганаровы госць

22 сакавіка ў Мінску ў выставачным комплексе па праспекце Пераможцаў, 14 пачне сваю работу XXX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Краіна, якая з'яўляецца Ганаровым госцем свята, — Расійская Федэрацыя.

У праграме расійскіх кнігавыдаўцоў, кнігараспаўсюджвальнікаў вялікае месца зойме знаёмства з пісьменнікамі Масквы, Санкт-Пецярбурга. У Мінск абяцаюць прыехаць празаікі, паэты, публіцысты Сяргей Шаргуноў, Андрэй Аствацатураў, Аляксей Варламаў, Таццяна Васкоўская, Дзмітрый Данілаў, Уладзіслаў Атрошанка, Леанід Юзэфовіч, Яраслава Пуліновіч, Раман Сенчын і іншыя. З юнымі наведвальнікамі выстаўкі будуць рады сустрэцца дзіцячыя пісьменнікі Расіі — Анастасія Строкіна, Андрэй Усачоў, Алена Булай, а таксама кніжны ілюстратар Даша Дзімітрава, якая малюе для кніг выдавецтва «Самокат».

У складзе расійскай дэлегацыі — старшыня Саюза пісьменнікаў Расіі празаік і публіцыст Мікалай Іваноў, галоўны рэдактар «Литературной газеты» паэт і празаік Максім Замшаў, празаік і публіцыст ураджэнец берасцейскіх Ганцавіч Алесь Кажадуб, які часта выдае свае кнігі і ў Беларусі.

Мікола БЕРЛЕЖ

Кветка з літпалетка

Сімвал мужнасці

І ў фальклоры, і ў літаратурных творах ёсць расліны-персанажы, што як падвойныя зоркі: калі і згадваюцца паасобку, то ў якасці выключэння, а найчасцей у пары. Так, «партнёрам» жыта выступае васілёк, а явар не ўпамінаецца без каліны. Але калі з жытам і васількамі ўсё зразумела, то «прапіска» каліны побач з яварам на першы погляд падаецца дзіўнай: хіба часта вы бачылі такое суседства ў жыцці?..

І, тым не менш, прычына хаваецца недалёка. Явар, альбо белы клён (па-лацінску — *Acer pseudoplatanus*) — прыгожае магутнае дрэва з раскошнай зводападобнай кронай — выступае сімвалам мужнасці, а каліна — невялікі куст з белымі кветкамі і чырвонымі ягадкамі — увасабленне жаноцкасці.

Ёсць у Максіма Багдановіча верш, які пачынаецца карцінай тугі і маркоты:

Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха напявае:
«Сцежка ў полі пралягае,
траўкай зарастае.
Каля сцежкі прыхіліўся явар да каліны, —
Там кахаліся калісь-то хлопец
і дзяўчына…»

Верш гэты датуецца 1911 годам. Ён увайшоў у адзін з цыклаў «Вянка» — «Згукі Бацькаўшчыны», у аснову якога М. Багдановіч паклаў наследаванне і паэтычную інтэрпрэтацыю народнай песеннай творчасці. І гэты, і іншыя творы цыкла сведчаць аб блізкім знаёмстве паэта з народнымі песнямі: тут і паралелізм вобразаў, і характэрныя канцоўкі. М. Багдановіч захапляўся фальклорам і бачыў яго як крыніцу ўзбагачэння нацыянальнай літаратуры: маўляў, шмат вершаў напісана па-беларуску, але мала з іх беларускіх па сваёй сутнасці.

Тэма кахання раскрываецца і ў вершы «Явар і каліна», напісаным Янкам Купалам годам раней, пры дапамозе падобнага вобраза:

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне пад ярам.

<…>
Чуецца музыка дзіўная
Ў повесцях сонных імшараў…
Цешыцца явар з калінаю,
Скінуўшы зімнія чары.

Словы гэтага верша былі пакладзены на музыку і безліч разоў гучалі са сцэны ў выкананні легендарных «Песняроў».

Пяру Уладзіміра Караткевіча належыць «Паэма пра явар і каліну», дзе раскрываецца тэматыка гістарычных падзей — змагання князя Давыда Гарадзенскага з крыжакамі, і на прыкладзе ваяра Яна — трагічнае каханне да палоннай прускай дзяўчыны. Вярнуўшыся ў складзе Давыдавага войска з пераможнага пахода, Ян прывёз чужаземную нявесту — паланянку, каханне да якой нівелявала той факт, што яна — прадстаўніца варожага народа. Нівелявала для яго, але не для маці — маці забітых на вайне з немцамі і прусамі старэйшых сыноў, удавы забітага там жа мужа… Яна атручвае нявестку, але гэты ж кубак з віном прыгубляе і яе сын… Маці загадвае хаваць суджэнцаў у розных магілах, каб і пасля смерці не даць ім злучыцца. Так, закаханыя леглі ў зямлю па розныя бакі ад царквы, але ўсё ж злучыліся, ператварыўшыся ў явар і каліну, што ўзраслі на месцах пахаванняў:

На магіле Марыі каліна
Ў кроплях вясёлкавых слёз,
А на магіле сына
Явар магутны ўзрос.

Дні ішлі, а дрэвы віліся
Паміж тысячаў дрэў жывых
І галінамі моцна спляліся
Над страхой заімшэлай царквы…

Над паэмай У. Караткевіч працаваў падчас адпачынку ў Юрмале ў жніўні 1976 года, а завершаны твор быў, згодна з пазнакай на рукапісе, у «12.20 ночы», у Гаграх (Абхазія), у Доме творчасці Саюза пісьменнікаў СССР. Паэма пабачыла свет пад вокладкай чацвёртага зборніка паэзіі У. Караткевіча «Быў. Ёсць. Буду». Ён склаў гэтую кнігу ў маі 1984 года, але не паспеў патрымаць у руках — яна выйшла пасля яго смерці, у 1986-м.

Цікавы ў гісторыі нашай літаратуры факт: найменне дрэва паслужыла псеўданімам адметнай паэтэсе. Святлана Явар — менавіта так падпісвала творы Святлана Сачанка (1968—2011). У асноўным гэта вершы, сярод якіх вылучаюцца проста-такі шэдэўральныя на тэму нераздзеленага кахання, і апавяданні. Пры знаёмстве з вершамі, лейтматывам якіх часта выступае туга па каханым, спроба прымірыцца з лёсам, калі ты разумееш, што каханне не ўзаемнае, першае, на што звяртаеш увагу — гэта неадпаведнасць тонкай датклівай лірычнай гераіні магутнаму мужчынскаму дрэву — явару… Але, пэўна, для Святланы быў у гэтым асаблівы сэнс: магчыма, псіхолаг заўважыў бы тут падсвядомы кампенсатарны механізм… Але не выключана, што ёй проста падабалася гэтае дрэва…

Дарэчы, нашы даўнія продкі надзялялі явар магічнай сілай, звязвалі з ім розныя закляцці. Верылі, што чараўнікі маглі пераўтварыць у явар нялюбых ім людзей — вось чаму дрэвы не секлі на дровы і пабудовы, не выкарыстоўвалі ў гаспадарцы нават лісце. А калі белыя клёны вырасталі на магілах нявінна пакараных ці загубленых людзей, верылі, што ў гэтыя дрэвы засяляліся душы памерлых.

Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Першы настаўнік

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. Згодна з абноўленым раскладам, пачуць вершы беларускіх аўтараў у праекце «Адным штрыхом» можна тройчы на дзень. Раніцай і вечарам у праграме «Радыёсерыял» твор Сельмы Лагерлёф «Пярсцёнак Лёвеншольдаў».

Праграма «Літаратурная анталогія» гэтым разам прапануе старонкі рамана Георгія Марчука «Кветкі правінцыі». У «Радыёбібліятэцы» таксама тройчы на дзень слухайце твор Івана Шамякіна «Адна на падмостках». Суботнім вечарам выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», дзе гучаць апавяданні беларускіх аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» у выхадныя — вершы айчынных паэтаў пра вясну.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у суботу складзе спектакль «Першы настаўнік» паводле аповесці Чынгіза Айтматава, у нядзелю прагучыць кампазіцыя пастаноўкі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Першы ўрок» паводле п'есы Канстанціна Губарэвіча (да 95-годдзя з дня нараджэння заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Зоі Асмалоўскай).

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У выхадныя ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» выйдуць пастаноўкі «Сябры чароўнага Матылька» паводле твора Барбары Эйсымант, «Калі Дракон прачнуўся» паводле п'есы Мікалая Арахоўскага, казкі пра сварку Сонца і Ветру, а таксама пра Нядзелю. Штовечар у 21.00 для маленькіх гучыць «Вячэрняя казка».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ». У нядзелю радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з пісьменніцай Раісай Баравіковай. Новы выпуск праекта «Літаратура на радыё» прагучыць у чацвер.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

5 сакавіка — 110 гадоў з дня нараджэння Льва Міхайлава (1913—1973), беларускага акцёра.

5 сакавіка — 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Калашнікава (1923—1994), беларускага акцёра, заслужанага артыста БССР.

6 сакавіка — 140 гадоў з дня нараджэння Івана Бялькевіча (1883—1960), беларускага мовазнаўца.

6 сакавіка — 100 гадоў з дня нараджэння Анатоля Ляляўскага (1923—1995), беларускага рэжысёра, народнага артыста Беларусі.

6 сакавіка — 75-годдзе адзначае Ганна Мезенка (1948), беларуская мовазнаўца.

7 сакавіка — 85 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Чарняўскага (1938—2013), беларускага археолага, пісьменніка.

7 сакавіка — 80 гадоў з дня нараджэння Алы Кабаковіч (1943—1985), беларускага літаратуразнаўца, паэтэсы, перакладчыка.

7 сакавіка — 70 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Кожуха (1953—2017), беларускага жывапісца.

8 сакавіка — 105 гадоў з дня нараджэння Міколы Ткачова (Мікалая Гаўрылавіча, 1918—1979), беларускага празаіка.

8 сакавіка — 70-гадовы юбілей святкуе Ларыса Салодкіна (1953), беларуская мастацтвазнаўца, мастацкі крытык.

10 сакавіка — 90 гадоў з дня нараджэння Серафіма Андраюка (1933—2022), беларускага крытыка, літаратуразнаўца.

10 сакавіка — 85 гадоў з дня нараджэння Рыгора Кірдзея (1938—2011), беларускага мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісца.

11 сакавіка — 120 гадоў з дня нараджэння Тодара Кляшторнага (1903—1937), беларускага паэта, перакладчыка.

11 сакавіка — 70-гадовы юбілей святкуе Раіса Галаватая (1953), беларуская мастачка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

11 сакавіка — 70-гадовы юбілей адзначае Уладзімір Ткачэнка (1953), беларускі скрыпач, гітарыст, кампазітар-аранжыроўшчык, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

9 сакавіка — у публічную бібліятэку № 21 (вул. Слабадская, 63) на прэзентацыю дзіцячай кнігі Іны Фраловай «Дзе была, Сарока?» Пачатак у 12.00.

9 сакавіка — на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Аўтограф» (вул. Карбышава, 42). Госць — пачынаючы аўтар Яніна Босак. Творчы кіраўнік — Іна Фралова. Пачатак у 18.00.

9 сакавіка — у літаратурны клуб «Спадчына» пры гімназіі № 35 г. Мінска (вул. Кіжаватава, 70) на творчую сустрэчу з Валерыем Максімовічам. Пачатак у 13.00.

9 сакавіка — у Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа на прэзентацыю кнігі Міхася Пазнякова «Між зямлёй і небам». Пачатак у 16.00.

10 сакавіка — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым у СШ № 20 (вул. Парніковая, 5). Пачатак у 14.30.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 02.03.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 707

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 517

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 23009